Пралетэ.

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XIV
№ 279 (3877)
НЯДЗЕЛЯ, 30 лістапада
1930 г.

Цана нумару 5 кап.
Выходзіць штодзённа за выключэньнем чацьвяргоў

Москва, Б-ко ІСНК СССР. СТУ.

ПРАЦЭС КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ—„ПРАМПАРТЫІ"

Рамзіны, Ларычавы, з аднаго боку і беларускія нацыянал-дэмакраты —Ластоўскія, Лёсікі, Цьвікевічы—з другога імкнуліся абярнуць СССР і яго фарпост БССР у калёнію сусьветнага капіталу

ІНТЭРВЭНЦЫЯ АДКЛАДЗЕНА, АЛЕ НЕБЯСЬПЕКА ІНТЭРВЭНЦЫІ НЯ ЗЬНІШЧАНА. БЫЦЬ НАПАГАТОВЕ!

Зьнішчым драпежныя шчупальцы інтэрвэнтаў у нашай краіне!

Гутаркі аб трывалай стабілізацыі, абцыі працоўных мас, яную ласкава адпускала ім буржуазія.

Пераход Савецкага Саюзу ў рэканструкцыйны пэрыяд, у шырокае сацыялістычнае наступленьне на капіталістычныя элемэнты нашай краіны, паварот пераважнай масы сярэдняцтва на сацыялістычны шлях разьвіцьця сельскае гаспадаркі, ажыцьцяўленьне палітыкі ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі — актывізавала барацьбу клясавага ворага супроць пралетарскай дыктатуры і звонку і ўнутры краіны.

Дыяпазон сродкаў, ужываных асуджанымі клясамі ў барацьбе супроць пралетарскай рэвалюцыі, хістаўся ад зьвярынага кулацкага тэрору ў вёсцы, нікараванага супроць вясковых актывістых і калгасьнікаў, ад шпіянажу і здрадніцтва за наяўны разьлік у франках, злотых і інш. валюце, прыпрайленага «ідэёвымі» разгалосьсямі з савецкай уладай, да найбольш утончаных мэтадаў навукова-тэхнічнага шкодніцтва.

Жалезная рука пралетарскай дыктатуры наносіла зьнішчальныя ўдары выступленьням клясавага ворага. Слаўная АДПУ раскрыла і абязшкодзіла шахцінскіх шкоднікаў, шкоднікаў у вайсковай, тэкстыльнай, суднабудаўнічай прамысловасьці, у мясной справе, у машынабудаўніцтве, у хэмічнай, залатой, нафтавай і іншых галінах прамысловасьці. Цяпер, дзякуючы пільнасьці вернага вартаўніка рэвалюцыі — АДПУ, на лавах падсудных загаварылі прадстаўнікі «прампартыі» — экс-кандыдаты ў міністры фашысцкай Расіі, рыхтуючыя дарогу крыві, тэрору, голаду і акупацыі для ўезду на белым кані старога расійскага дзяржымоды.

Шкоднікі па простым заданьні былых гаспадароў расійскай прамысловасьці—Рабушынскіх, Нобэляў, Манташавых і іншых гэроў «Торгпрома» ў Парыжы, а таксама па дырэктывах капіталістычных генштабаў, у першую чаргу францускага і польскага, павінны былі, як паказвае шкодник Рамзін, так паставіць справу, каб «стварыць найбольшы разгар эканамічных крызісаў і затрудненьняў іменна к лету 1930 году, што ў пэўнай ступені — паводле цынічнай заявы Рамзіна — і было дасягнута». Уся работа шкоднікаў, шпіёнаў і здраднікаў знаходзілася ў шчыльнейшай сувязі з распрацаванымі ў цішыні францускага генштабу планамі ўзброенай інтэрвэнцыі ў 1930 годзе.

У плянах інтэрвэнцыі міжнароднай контр-рэвалюцыі вяпэярную ролю — ролю пачынальніка павінна была адыгрываць фашысцкая Польша. Аб яе ролі ў інтэрвэнцыі, якая падрыхтоўвалася, і аб бязьмежных захватніцкіх апэтытах польскіх фашыстых Рамзін у сваіх паказаньнях падрабязна інфармаваў савецкі суд. У сьвятле яго паказаньняў выяўляецца да канца зьмест «пацыфікацыйных» карных экспэдыцый на Зах. Украіне і Зах. Беларусі. Жудасны акупацыйны тэрарыстычны рэжым на Зах. Беларусі і Зах. Украіне — курс на фізычнае зьнішчэньне камуністых і рэвалюцыйнага актыву рабочае клясы, на разгром і задушэньне антыфашысцкага блёку і яго сустаўной часьці нацыянальна-вызваленчага руху, арышты, руйнаваньне бядняцка-сярэдняцкіх мас беларускае вёскі штрафамі, рабункам сэрвітутных правоў (права на пасьбу скаціны ў лесе, які юрыдычна належыць памешчыку) і г. д. — знаходзіцца ў простай сувязі з ліхаманкавымі падрыхтаваньнямі капіталістычнага сьвету да Інтэрвэнцыі. Мышыная бегатня з усякімі аграрнымі канфэрэнцыямі, экскурсіямі прэзыдэнтаў і генштабістых — набывае спэцыфічнае значэньне. Савецкі друк даўно выкрыў ваенны характар гэтых фактаў. Паказаньні Рамзіна, пацьвярджаючы заключэньні савецкага друку, адкрываюць вочы самаму адсталаму рабочаму або дробнаму буржуа на Захадзе на сапраўднае значэньне «аграрных канфэрэнцый», — «прыцыдэскіх прагулак» маршалаў і прэзыдэнтаў у сталіцы суседніх дзяржаў.

Вядома, БУРЖУАЗНЫЯ ЭЛЭМЭНТЫ раней прыгнечаных царызмам нацыянальнасьцяй не маглі заставацца ў баку ад контр-рэвалюцыйных, антысавецкіх «происков» міжнароднай буржуазіі. Пралетарская рэвалюцыя, нясучы працоўным масам Беларусі вызваленьне ад падвойнага ярма сацыяльнага і нацыянальнага ўдзіску, экспрапрыявала беларускіх экспрапрыятараў побач з буржуазіяй усіх іншых нацыянальнасьцяй. Гэтыя элемэнты ў асобе Ластоўскіх, Лёсікаў, Некрашэвічаў, Булак-Балаховічаў, у шчыльнейшым саюзе з вялікадзяржаўнай расійскай контр-рэвалюцыяй, з украінскімі буржуазнымі «незалежнікамі» накшталт пагромшчыка Пятлюры, вялі з першых дзён кастрычніка непрымірымае ўзброенае змаганьне супроць пралетарыяту Беларусі, які змагаўся рука ў руку з рабочай клясай усяго Савецкага Саюзу. У гэтым змаганьні клясавыя ворагі беларускіх працоўных мас заключалі здрадніцкія зьдзелкі з царскімі генэраламі, ідучымі супроць працоўных пад сьцягам «адзінай і непадзельнай», з кайзэрам, таптаўшым жалезным ботам сваёй акупацыі хацінкі беларускай галечы, з францускім генштабам, з бандытам Булак-Балаховічам і з манархістыкшым эсэрам Савінкавым, з дэфэнзыўных спраў майстрамі з кампаніі Піпсудзкага, стараючымі на пажарышчах Зах. Беларусі Польшчу «од можа до можа».

Перамога беларускіх працоўных мас, затрыманая над акупантамі і інтэрвэнтамі і ў саюзе з працоўнымі ўсяго Саюзу, пад кіраўніцтвам партыі пралетарыяту і яе ленінскага ЦК, прымусіла беларускую контр-рэвалюцыю пасьледаваць пры кладу Рамзіных, Чаянавых, Яфрэмавых і зьмяніць тактыку. Прыкрываючыся і зьмяніць тактыку. Прыкрываючыся заявамі аб лёяльнасьці ў адносінах да савецкай улады, яны папрабавалі з сярэдзіны ўзарваць сацыялістычнае будаўніцтва ізнутры і ў прыватнасьці будаўніцтва сацыялістычнай культуры — нацыянальнай па форме, пралетарскай па зьмесьце.

РЭАКЦЫЮ БЕЛАРУСКІХ ПРАЦОЎНЫХ МАС НА НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ЦЭНЗІК І ЭКСПЛЭАТАЦЫЮ ПРЫ ЦАРЫЗЬМЕ, АБВОСТРАНУЮ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЯНЫМА ВЫЛАЗКАМІ ВЯЛІКА-ДЗЯРЖАЎНАГА РАСІЙСКАГА ШАВІНІЗМУ ПАСЬЛЯ РЭВАЛЮЦЫІ, НАЦЫЯНАЛ-ДЭМАКРАТЫ ПРАБАВАЛІ ВЫКАРЫСТАЦЬ У СВАІХ ВАРОЖЫХ ДЛЯ ПРАЦОЎНЫХ МЭТАХ. Яны таксама прабавалі пад прыкрыцьцём установак і выступленьняў нацыянальных апартуністых унутры партыі стварыць глебу для рэстаўрацыі капіталізму ў нашай краіне, для падрыхтоўкі ўмоў для наступленьня інтэрвэнтаў.

У шчыльнейшым ідэйна-палітычным кантакце з беларускімі нацыянал-фашыстымі, агентамі польскай дэфэнзывы на Зах. Беларусі, яны падрыхтоўвалі глебу, на якой пад назвай Беларускай Народнай Рэспублікі павінна была расквітнець буржуазна-фашысцкая Беларусь Радзівілаў, Скірмунтаў, Луцкевічаў і «сялян-культурнікаў» тыпу вясковага эксплёататара, кулака Мароза. Гэта «незалежная» буржуазна-фашысцкая Беларусь, вядома, апынулася-б у «фэдэрацыі» і пад скіпэтрам аўтараў «цудаў над Віслай» і «цудаў у выбарчай урне», але гэтага іменна і трэба «адраджэнцам», бо лепшага бізуна для прымусу працоўных да паслухмянства эксплёататарам, чым нагайка польскага фашызму, яны ня змогуць знайсьці.

Мэты і задачы нацыянал-дэмакратаў — сутнасьць іх «адраджэнчай» ідэалёгіі лепш за ўсё характарызуюць ПРАГРАМНЫЯ ІМКНЕНЬНІ «НАШАЙ НІВЫ» Ў 1909 Г. — АБ СТВАРЭНЬНІ З БЕЛАРУСІ ДАМІНІЁНУ ПА ЎЗОРЫ КАНАДЫ ЎНУТРЫ РАСІЙСКАЙ ІМПЭРЫІ РАМАНАВЫХ, РЭФАРМАВАНАЙ ПАВОДЛЕ АНГЕЛЬСКАГА ПРЫКЛАДУ, ПРАКТЫКІ НЕКРАШЭВІЧАЎ У 1919 Г. І НАЦЫЯНАЛ-ФАШЫСТЫХ ЛУЦКЕВІЧА, АСТРОЎСКАГА, СТАНКЕВІЧА, ЯРЭМЧА Ў ЗАХ. БЕЛАРУСІ Ў НАШЫЯ ДНІ.

Ня менш ярка выкрывае контр-рэвалюцыйную, эксплёататарскую сутнасьць нацыянал-дэмакратаў тэорыя аб адзінстве беларускае нацыі—аб яе «працоўным» характары. Гэта тэорыя мела сваёй задачай замаскаваць пад зашчытны «працоўны» копер кулака і гарадзкога эксплёататара і ў клясавым змаганьні разбройць рабочага і асноўныя бядняцка-сярэдняцкія масы. Туіс-ж мэту мелі і гутаркі аб славутай «самабытнасьці».

Тав. ГЕЙ на апошнім Менскім партактыве дасканала выявіў сутнасьць і цану гэтай «самабытнасьці».

«Мы ведаем,—казаў т. Гей—што беларускі нацыянал-дэмакратызм арыентаваўся НА КАПІТАЛІСТЫЧНЫ ЗАХАД у процівагу пралетарскай Маскве і ЧАСТКОВА АРЫЕНТАВАЎСЯ НА БУРЖУАЗНУЮ ПОЛЬШЧУ. Гэта арыен таваньне зьвязвалася ў поўнай меры афармленым імкненьнем да стварэньня беларускай народнай «рэспублікі», якая ў нашых умовах, на данай ступені разьвіцьця імпэрыялізму была-б НІЧЫМ ІНШЫМ, ЯК ДЫКТАТУРАЙ ФАШЫЗМУ. У радох нацыянал-дэмакратызму быў «САМАБЫТНІЦКІ», «НЕЗАЛЕЖНІЦКІ» струмень, які то ўзмацняўся, то аслабляўся... Справа з самабытнасьцю стаяла, прыкладна, так: узмацняюцца надзеі на ўнутраны пераварот, на кулацкае паўстаньне ўнутры СССР—узмацняецца «самабытніцкае» крыло нацыянал-дэмакратызму, калі-ж надзеі на кулацкае паўстаньне аслабляюцца, дык узмацняюцца надзеі на польскую інтэрвэнцыю, узмацняецца заходная арыентацыя, аслабляецца «самабытніцкае» крыло».

Нацыянал-дэмакраты, як гэта відаць па рабоце раду савецкіх установ: НКА (пры ІГНАТОЎСКІМ І БАЛІЦКІМ), БДВ (пры ЖЫЛУНОВІЧЫ І ШЫПІЛЕ), НКЗ (пры ПРЫШЧЭПАВЕ, АДАМОВІЧУ А.), ІНБЕЛКУЛЬТУ і потым БАН (пры ІГНАТОЎСКІМ)—мелі сур'ёзны ўплыў на лінію гэтых установ, прыводзячы ня толькі да скажэньня лініі партыі ў гэтых установах, але часта, апіраючыся на нацыянал-апартуністых, яны прыводзілі да поўнай падмены лініі партыі нацдэмаўскай практыкай. Галоўныя свае намаганьні нацыянал-дэмакраты накіроўвалі на захват у свае рукі работы ў галіне культуры і сельска-гаспадрчай эканомікі.

«Нацыянал-дэмакратызм зьяўляўся натхніцелем і правадыром хутарызатарскай зямельнай палітыкі, якая рабіла стаўку на кулака і імкнулася паварнуць сельскую гаспадарку на шлях капіталістычнага разьвіцьця». (II Кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б, 1930 г.).

Яны дальнабачна браліся за справу ўмацаваньня і пашырэньня сваёй сацыяльнай базы—кулацтва.

Невыпадкова таксама нацыянал-дэмакратызм усе сілы накіроўвае на тое, каб культурнае будаўніцтва БССР пайшло па шляху стварэньня культуры, буржуазнай па сваёй зьмесьце і нацыянальнай па сваёй форме. За многія гады работы БДВ здолела выдаць толькі сем брашур, папуляризуючых ідэі марксызму-ленінізму, выдаючы дзесяткі і сотні брашур чужых, варожых дыктатуры пралетарыяту.

Улюбёнай формай скарыстаньня нацыянал-дэмакратамі савецкай легальнасьці для змаганьня з пралетарскай дыктатурай і для прапаганды сваіх погляду былі: літаратурная крытыка (тэатральная дыскусія—ДУДАР-ГЛЫБОЦКІ, КУПЦЭВІЧ і інш.), паэзія, бэлетрыстыка і нарыс («Крывічы», «Падарожжа на Новую Зямлю»—М. ЗАРЭЦКАГА, «І пурпуровых ветразей узьвіны»—ДУБОЎКІ, «Случчына»—ЛУЖАНІНА», «Лісты да сабакі»—Я. ПУШЧЫ, падобныя матывы часамі гучэлі ў творах і другіх беларускіх пісьменьнікаў, у тым ліку Янкі Купалы і інш.). Яны выкарыстоўвалі таксама гісторыю і мовазнаўства (ідэалізацыя фэадальнага мінулага Беларусі, арэхаізацыя і правінцыяналізацыя мовы, барацьба супроць «саветызмаў»—новых слоў, якія адлюстроўваюць тыя зрухі, што зрабіла ў нас рэвалюцыя).

У аповесьці «Крывічы» Зарэцкага найбольш ярка сфармулявана нанавісьць нацыянал-дэмакратаў да машынабудаўніцтва. Яны баяліся пралетарыяту, да фабрыкі. Яны марылі аб сельска-куплацка-саматужнай Беларусі, якая была-б hinterland'ам — сыравой калёніяй чужаземнага капіталу, у якой малаілі фабрычна-заводзкі і транспарт ны пралетарыят быў-бы моцна закуты ў ланцугі фашысцкага тэрору і акупанцкага ваеннага рэжыму. Як бачым, нацыянал-дэмакраты невыпадкова ў кулацкіх паўстаньнях, як сустаўной часьці інтэрвэнцыі, бачылі шлях да «адраджэньня» буржуазна-фашысцкай Беларусі.

Партыя разгорнутым фронтам вяла і вядзе непрымірымае змаганьне супроць контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму і супроць нацыянал-апартунізму. Гэтае змаганьне з усёй яскравасьцю выкрывала той факт, што «рукамі нацыянал-апартуністых дзейнічаў наш клясавы вораг»... Нацыянал-апартуністы на справе аказаўся «такім-жа нацыянал-дэмакратам, толькі з партбілетам у кішэні». II пленум ЦК КП(б)Б пастанавіў прызнаць несумяшчальным з прыналежнасьцю да партыі ня толькі прапаганду нацыянал-апартуністычных поглядаў, але і падзяленьне поглядаў, салідарызацыю з імі.

Разграмляючы і вытручваючы вялікадзяржаўны расійскі шавінізм, як галоўную небясьпеку, партыя выкрыла ў вачох працоўных контр-рэвалюцыйную сутнасьць і шкодніцкі характар работы беларускіх саюзьнікаў Рамзіных, Кандрацьцевых, Яфрэмавых з СВУ і іншых агентаў сусьветнай контр-рэвалюцыі, таксама як і шавіністых усіх іншых нацыянальных адценьняў.

ГЭТАЕ БЯЗЬЛІТАСНАЕ ЗМАГАНЬНЕ ПРЫВЯЛО ДА ТАГО, ШТО Ў ВЫНІКУ ЯГО ЗАРАЗ ОРГАНАМІ ДПУ БЕЛАРУСІ САРВАНА КАНЧАТКОВА МАСКА З ГРУПЫ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ НАЦЫЯНАЛ-ДЭМАКРАТЫЧНАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ, пазбаўленай усякага ўплыву ў масах, якая, па-двурушніцку абяцаючы пралетарыяту добрасумленна працаваць у інтарэсах савецкага будаўніцтва, на справе працягвала контр-рэвалюцыйную работу ў згодзе і па ўказаньнях зарубежных буржуазных нацыянал-фашысцкіх арганізацый. Арыштован рад контр-рэвалюцыянэраў. Усе гэтыя даўно і добра вядомыя асобы—былыя «міністры» БНР і белагвардзейскія эмігранты, накшталт Ластоўскага, Цьвікевіча, Краскоўскага, Смоліча, Лёсіка ці Некрашэвіча—б. агента генэрала Бэртэлё—эсэраўска-белагвардзейскі букет.

ПРАЦОЎНЫЯ МАСЫ БССР І ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСІ, САВЕЦКАЯ ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ З ВЯЛІЗАРНЕЙШАЙ ПАГАРДАЙ І НЯНАВІСЬЦЮ АДНОСЯЦЦА ДА ГЭТЫХ «АДРАДЖЭНЦАЎ» КАПІТАЛІСТЫЧНАГА ПЕКЛА, — САЮЗЬНІКАЎ ДЭФЭНЗЫВЫ, ЯКІЯ ІШЛІ ПА ШЛЯХУ РАМЗІНЫХ, РЫХТАВАЛІ КРЫВАВУЮ ЛАЗЬНЮ ПРАЦОЎНЫМ МАСАМ НАШАЙ КРАІНЫ, КАВАЛІ КАЙДАНЫ АКУПАЦЫІ, НАЦЫЯНАЛЬНАЙ НЯВОЛІ ДЛЯ БССР І ПАДРЫХТОЎВАЛІ ЗВАРОТ ЗЯМЛІ ПАМЕШЧЫКАМ І ФАБРЫК КАПІТАЛІСТЫМ.

Працоўныя масы БССР, савецкая інтэлігенцыя, пад кіраўніцтвам пралетарыяту, яшчэ шчыльней згуртуюцца вакол камуністычнае партыі бальшавікоў Беларусі і яе ЦК, каб яшчэ хутчэй, у нагу з працоўнымі ўсяго Савецкага Саюзу, будаваць сацыялізм і ўмацоўваць магутнасьць і абароназдольнасьць нашай краіны.

Пралетарыят, асноўныя масы сялянства ды савецкая інтэлігенцыя ў адказ на шпіёнскую, шкодніцкую работу агентаў міжнароднай інтэрвэнцыі павышаюць напружанасьць сваёй працы, удзесяцяраюць свае высілкі ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва.—Мы павінны дабівацца баявога правядзеньня месячніка беларусізацыі, — мы павінны пераможна закончыць ільназагатоўкі, — мы павінны з вялізарнейшай актыўнасьцю праводзіць мабілізацыю фінансавых сродкаў, — мы павінны біцца як чэрці за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу і трэцяга рашаючага году пяцігодкі, — мы павінны ўзмацняць абароназдольнасьць нашай краіны, — мы павінны! — Мы будзем! — Мы дасягнем новых вялізарных посьпехаў! Гэта будзе лепшым адказам інтэрвэнтам і іх агентам з лягеру вялікадзяржаўных контр-рэвалюцыянэраў — як і з лягеру беларускіх контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў.

Выкрыцьцё і арышт контр-рэвалюцыйнай групы нацыянал-дэмакратычнай інтэлігенцыі—агентаў чужаземных буржуазных і Заходня-беларускіх нацыянал-фашысцкіх арганізацый — ня толькі ня зьнімае з параду дня змаганьня з нацыянал-дэмакратызмам, але, наадварот, патрабуе ад нас яшчэ больш рашучага змаганьня за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі, патрабуе асабліва ўважлівага пераглядзу ўсёй установкі нашай работы, асабліва на культурным фронце, у навуковых, асьветных, выдавецкіх установах з тым, каб накіраваць іх работу на марксыцька-ленінскія рэйкі. Партыя павінна ўзмацніць работу ў галіне беларусізацыі згодна з дырэктывамі II пленуму ЦК КП(б)Б і завастрыць барацьбу супроць расійскага вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе. Гэта апошняе набывае тым большае значэньне, што партыя павінна параліжаваць усякія спробы вялікадзяржаўнага шавінізму скарыстаць выкрыцьцё і арышт гэтай конт-рэвалюцыйнай інтэлігенцка-міністэрскай групы для свайго рэваншу. Разам з тым партыя павінна ўзмацніць змаганьне і з іншымі шавінізмамі, якія прабуюць выкарыстаць раскрыцьцё гэтай групы, каб актывізаваць і ўцягнуць у свае здрадніцкія сеткі працоўныя масы.

Непахісна праводзячы ленінскую нацыянальную палітыку, вядучы рашучае змаганьне за генэральную лінію, цьвёрда трымаючы курс на ліквідацыю кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі, даючы бязьлітасны адпор правым і «левым» апартуністым і іх рознавіднасьці—нацыянал-апартуністым, моцна ўдараючы на фракцыянэрах з права-«лявацкага» блёку—партыя забясьпечыць канчатковую перамогу ра бочай клясы, калгасных і бядняцка-сярэдняцкіх мас вёсні над міжнародным контр-рэвалюцыйным і яе агентамі ўнутры краіны.

Паказаньні падсуднага Чарноўскага

Сьледам за Калініньнікавым на вячэрнім пасяджэньні 26 лістапада пачаў свае паказаньні падсудны Чарноўскі. Расказаўшы аб сваім уступленьні ў 1927 годзе ў шкодніцкі цэнтр, аб структуры гэтай арганізацыі, ён падрабязна спыняецца на сувязі «прампартыі» з заграніцай. Прыцягальнае значэньне для шкоднікаў мелі тыя, хто знаходзіўся за «Торгпромом». За яго сьпіной сталі больш магутныя дзяржавы і ў першую чаргу Францыя з яе фінансавым і тэхнічным падтрыманьнем і генэральным штабам. Непасрэднымі-ж выканаўцамі намячаліся Польшча, Фінляндыя і Румынія. Гэтыя, цьвёрда сказаныя словы выклікаюць моцнае абурэньне ў залі суда. Старшыня вымушан патрабаваць захаваньня цішыні.

Чарноўскі далей даказвае, што простая садзейнасьць і насяганьне на савецкі лад набочных асоб зьяўлялася асноўнай прычынай стварэньня контр-рэвалюцыйнай арганізацыі, якая паставіла сабе мэтай зьвяржэньне савецкай улады. Чарноўскі пацьвярджае, што ў адносінах сялянскай гаспадаркі ўстаноўка была на моцнага кулака і падкрасьлівае, што на гэтым асабліва настойваў «Торгпром». Асабліва падрабязна ён спыняецца на пытаньнях плянаваньня, паказваючы, што была ўстаноўлена цэлая шкодніцкая сыстэма. Складаліся направільныя разьлікі. Агенты імпэрыялізму імкнуліся ўцягнуць дзяржаву ў непрадукцыйныя затраты вялікіх сум. Запягалася праектаваньне новых прадпрыемстваў. Праз рукі Чарноўскага прайшло звыш 100 праектаў, якія зьмяняліся па 5 раз. Паравоза-будаўнічыя заводы і камбінаваныя прадпрыемствы чакалі заданьняў і інструкцый. Даваўся дзесятак варыянтаў і ні адзін не ажыцьцяўляў канчатковага зацьвярджэньня. Шкоднікі затрымлівалі будаўніцтва Сьвярдлоўскага і Краматорскага машынабудаўнічых заводаў, якія адыгрываюць важнейшую ролю ў абсталяваньні горнай прамысловасьці. Старшыня суда пытае, а чым вытлумачыць недахопы плянаваньня па радзе галін?

Чарноўскі адказвае, што ў гэтым напрамку ўплываў інжынэрна-шкодніцкі цэнтр, які даваў шкодніцкія дырэктывы і інструкцыі. Пасьля гэтага Чарноўскі дае тлумачэньні на пытаньні аб заданьнях, атрыманых ад францускага генштабу. Гэтыя заданьні даваліся шкоднікам у розных галінах прамысловасьці. У тым ліку і прамысловасьці, якая мае значэньне для абароны краіны. Дыверсыйныя заданьні ўводзіліся да дэзарганізацыі электразабесьпячэньня, транспартнай, тэлеграфнай сувязі. Тыповай спробай амярцьвеньня капіталу, якая, аднак, ня мела практычных рэзультатаў, зьяўляецца новае Сормава.

На гэтым у 11 гадзін вечара пасяджэньне спэцыяльнай прысутнасьці Верхоўнага суда канчаецца.

Раніцой 27 лістапада на пасяджэньні спэцыяльнай прысутнасьці Верхсуда СССР дае далей свае тлумачэньні падсудны Чарноўскі.

Чарноўскі пераходзіць да расказу аб

ЧАРНОЎСКІ

сваім блізкім удзеле ў шкодніцкай рабоце і спыняецца на пытаньні аб мэтадах шкодніцкай работы. Я вінавачу сябе і сваіх таварышоў у тым, што мы, ставячы сабе шкодніцкія мэты, дапускалі такую пастаноўку пытаньня, калі рашэньне аб максымуме або мінімуме якіх-небудзь плянаў будаўніцтва мы не пацьвярджалі ніякімі разьлікамі. Такое сьвядомае дапушчэньне безадказнасьці з боку інжынэраў было прадыктавана шкодніцкай арганізацыяй. Верхавінка буржуазнага інжынэрства не разглядала прамысловае будаўніцтва, як сваю ўласную справу, з якім зьвязаны яго-ж уласныя інтарэсы, і натуральна таму, што яны аказаліся ў лягеры шкоднікаў і інтэрвэнтаў.

Далей Чарноўскі ўзмоцнена падкрэсьлівае, што калі-б кожны інжынэр адчуваў маральную адказнасьць за справу, гады ня было-б пытаньня аб шкодніцтве.

Паказаўшы, якую ролю ён адыгрываў у ЦК «прампартыі», як пасярэднік паміж «Торгпромом» і шкодніцкай арганізацыяй металяпрамысловасьці, Чарноўскі ў канцы сваіх тлумачэньняў гаворыць: «Прызнаючы сябе вінаватым, я нікольні не стараюся зьмякчыць сваю віну. Мне цяжка і балюча прызнацца, што інжынэры, і я ў тым ліку, далі адцягнуць сябе ад прыгожай ролі кіраўнікоў у вялікай справе прамысловай рэканструкцыі, якая выконвецца ў такім грандыёзным маштабе, і што мы прамянялі гэту ролю на ролю служкаў капіталу і сталі зброяй у руках варожага акружэньня».

Паказаньні падсуднага Купрыянава

Прызнаючы сябе вінаватым, Купрыянаў расказвае, як ён вёў шкодніцкую работу ў тэкстыльнай прамысловасьці. Купрыянаў гаворыць, што яго работа ў тэкстыльнай прамысловасьці пачалася яшчэ ў 1919 годзе. Лапацін, які меў сувязь з былымі ўласьнікамі тэкстыльных прадпрыемстваў, паставіў перад ім задачу захаваньня прадпрыемстваў. Трэба было перашкодзіць пераклідзе машын з адной фабрыкі на другую. У пэрыяд НЭПу шкодніцкая работа атрымала іншы напрамак: трэба было рамантаваць фабрыкі, каб яны з часам перайшлі у арэнду былым уласьнікам на поўным ходу. Да гэтага часу афармляецца шкодніцкая група тэкстыльнай прамысловасьці, у склад якое ўваходзяць: Лапацін, Фядотаў, Купрыянаў і інш.

Купрыянаў далей падрабязна расказвае, якімі спосабамі шкодніцкая група на працягу раду год руйнавала тэкстыльную прамысловасьць. Шкодніцтва гэта выяўлялася ў непатрэбным будаўніцтве фабрык з капітальнымі затратамі, разьлічанымі на доўгія тэрміны, у нерацыянальным скарыстаньні сырцу і выпрацоўцы асартымэнту тканін, якія не адпавядалі патрабаваньням рынку, у затрыманьні тэкстыльнага машынабудаўніцтва ўнутры краіны ў выглядзе заказаў імпартнага абсталяваньня для гэтай прамысловасьці.

Пераходзячы да сваёй ролі ў падрыхтоўцы інтэрвэнцыі, Купрыянаў нічога новага ня ўносіць у тое, што ўжо было сказана перад ім падсуднымі. Канчаючы свае паказаньні, Купрыянаў гаворыць:

«Я ўпэўнен, што чыстасардэчнае пакаяньне ўсіх падсудных і выкрыцьцё перад Вярхоўным судом усіх гэтых ганебных дзеяньняў адаб'е ахвоту ў «Торгпрома» і ўсіх іншых падобных арганізацый арыентавацца на ўнутраную дапамогу.

Падпальшчыкі інтэрвэнцыі перад судом рабочае клясы

Наіўнасьць ці палітычная двулічча? Тры дні цэнтральны камітэт «прамысловай партыі» тлукачыў Вярхоўнаму суду свае злачынствы. Тры дні паважныя, сівалосыя прафэсары з акадэмічным спакоем выкладалі д'абальскую тэорыю шматлюднага «очковтирательства», мэтадалёгію пусканьня пылу ў вочы, навуку канцэнтраванага ашуканства працоўных. Яны расказвалі суду аб сустрэчах з «Торгпромом», называлі грашовыя сумы, атрыманыя з-заграніцы, паведамлялі суду імёны кіраўнікоў францускага генэральнага штабу, якія сумесна выпрацоўвалі плян узброенай інтэрвэнцыі супроць працоўных савецкай краіны.

Аднак, на працягу ўсіх трохдзённых паказаньняў старанна абыходзілася адно пытаньне — пытаньне аб белым тэроры, як мэтадзе інтэрвэнцыі, як сродку буржуазна-памешчыцкай дыктатуры ў выпадку ўпаду савецкай улады. Ні адзін з падсудных не сказаў слова аб белым тэроры, які падрыхтоўваўся. Рабіліся дакладныя выкладкі і разьлікі аб тым, колькі краіна траціла, з прычыны шкодніцтва «прампартыі». мэталю, колькі было загублена кілёват-гадзін электрычнай энэргіі, якія страты рабочая кляса мела ад... штучнага затарможэньня тэмпаў будаўніцтва, а потым ад празьмернага раздуваньня будаўніцтва. Але ні разу, ня гледзячы на ўсе так званыя «чыстасардэчныя пакаяньні», ні Рамзін, ні Ларычаў, ні Чарноўскі — ніхто з падсудных не сказаў, што яны, шкодні кі і інтэрвэнты, меркавалі зьнішчаць мільёны жыцьцяў працоўных.

Цяпер «тлумачэньні» скончыліся. Пачаўся допыт падсудных. І натуральна, гэтага пытаньня нельга было абыйсьці. Пытаньне гэта было пастаўлена падсудным проста ва ўпор.

І што-ж? Як адказалі на яго падсудныя?

Вось тут падсудныя адразу трацяць акадэмічны спакой. Гутарка-ж ідзе ўжо не аб чорнай мэталургіі і аб волане, а гутарка ідзе аб патоках крыві. Пуанкарэ-Вайна агаляе тут свае сапраўдныя крыважэрныя клыкі. З вайной адначасовы ўдар інтэрвэнцыяністкіх армій на Маскву і Ленінград адразу ператвараецца з стратэгічнай лініі ў крывавы шлях масавых расстрэлаў працоўных. Здань масавага зьнішчэньня, здань дзікага, ашалелага ад крыку рабочых і сялян белага тэрору падымаецца і займае сваё месца на лаве падсудных за плячыма кожнага з іх. І падсудныя пачынаюць самым подленькім чынам выкручвацца. Адзін за другім яны прабуюць адвесьці ад сабе гэту здань. Праскаленыя машынкі раптам забываюць аб сваім так званым «поўным і чыстасардэчным пакаяньні», аб якім можны в іх з пафасам заяўлў пры першым другым ня-

Шкоднікаў—расстраляць!

Агульны сход супрацоўнікаў ЦВК у дзень пачатку працэсу над шкоднікамі — агентамі сусьветнага імпэрыялізму, выказвае сваё глыбокае абурэньне гнуснай шкодніцкай работай удзельнікаў «прампартыі» і патрабуе для іх вышэйшай меры сацыяльнай абароны — расстрэлу.

Супрацоўнікі ЦВК у адказ на падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць краіны Саветаў пастанаўляюць дадаткова падпісацца на 30 проц. месячнага акладу на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады».

* * *

Калектыў Брагінскага райсельбанку ў адказ на шкодніцтва контр-рэвалюцыйнай групы — «прампартыі», узмацняе сацыялістычнае будаўніцтва павялічэньнем падпіскі на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады».

Калектыў выклікае райкаан. і райспажыўтаварыства.

* * *

На шкодніцтва буржуазных спэцыялістых (Рамзін і інш.), на падрыхтоўку замежнымі капіталістымі новай інтэрвэнцыі, новай вайны супроць СССР, —бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту, — студэнты і навуковыя работнікі пэдфаку БДУ адказваюць яшчэ большым згуртаваньнем вакол ленінскай бальшавіцкай партыі, разгортваньнем сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце супроць капіталістычных элемэнтаў у горадзе і ў вёсны, супроць капіталістычнай тэорыі і ідэалёгіі, супроць панікёрскіх енкаў правых і «левых» апартуністых, за генэральную лінію партыі.

* * *

Агульны сход супрацоўнікаў ашчадкас дадучаецца да таго нялікага абураньня, якім ахоплены працоўныя масы Саюзу ў зьвязку з выкрытай контр-рэвалюцыйнай, шкодніцкай дзейнасьцю «прампартыі».

Патрабуючы ад савецкай улады самай суровай кары для шкоднікаў сацыялістычнага будаўніцтва і ворагаў рабочае клясы, калектыў працоўнікоў абавязваецца яшчэ больш напружана працаваць над выкананьнем пастаўленага ўрадам заданьня на мабілізацыі сродкаў.

Калектыў абавязваецца разгарнуць шырэй сацспаборніцтва і ўдарніцтва пад пёзунгам: «увесь ашчадны апарат — ударная брыгада па выкананьні фінплану».

КУЛЬТПРОП ФРУНЗАЎСКАГА РК КП(б)Б паведамляе, што 1-га сьнежня а 6-й гадз. увечары ў памяшканьні Дому Камасьветы

СКЛІКАЕЦЦА

НАДЗВЫЧАЙНЫ ЗЬЛЁТ

усіх сакратароў пах. парт'ячэек, загадчыкаў сэктараў вучобы разам з прапагандыстамі нармальных партыйных школ, а таксама пашча вылучаных,—па пытаньні аб правядзеньні ўдарнага дня партыйнай вучобы.

Яўка свавчасова і абавязкова.

Партыйнае будаўніцтва

У першай палове сьнежня--раённыя канфэрэнцыі батрацка-бядняцкіх груп

Разгарнуць падрыхтоўку да іх правядзеньня, праверыць стан работы ячэек КП(б)Б сярод батрацтва і беднаты

Бязьлітасна біць і выкараняць апартуністычную недаацэнку важнейшай работы партарганізацый, мабілізаваць батрацтва і беднату на выкананьне задач па калектывізацыі, узмацніць наступленьне на кулацтва

Па-баявому разгортваць работу сярод батрацтва і беднаты

Ажыцьцяўленьне задач партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі патрабуе рашучага паляпшэньня работы сярод батрацтва і беднаты з боку раённых партарганізацый і партыйных ячэек. Між тым, у радзе раёнаў (Лёзьнянскі, Лоёўскі і інш.) гэта работа пастаўлена надзвычай дрэнна. Гэта зьявілася вынікам таго, што рад паасобных камуністых, нават кіраўнікоў ячэек, яўна недаацэньваюць работу сярод беднаты і батрацтва. Стаўшы на яўна апартуністычны пункт гледжаньня, гэтыя таварышы лічаць, што шпаркім разгортваньнем калектывізацыі пытаньне работы з беднатой і батрацтвам зьнімаецца з парадку дня партыйных ячэек. Апартуністыя часамі прабуюць давесьці, што «разгортваньне работы сярод батрацтва і беднаты ў калгасах аслабляе саюз батрацтва і беднаты з серадняком і г. д.».

Такім настроям, якія выходзяць ад апартуністычных элемэнтаў, ад кулацкай агентуры ў партыі, павінен быць даны самы жорсткі адпор!

XVI зьезд УсеКП(б) сказаў: «Работа груп беднаты ў пачатковых формах калектыўных гаспадарак павінна быць палепшана і ўзмоцнена, бо толькі апіраючыся на беднату, можна забясьпечыць пераход прасьцейшых аб'яднаньняў на вышэйшую ступень калектывізацыі. Партыйныя арганізацыі ў калгасах павінны забясьпечыць такую пастаноўку работы груп беднаты, каб яны ня толькі абаранялі непасрэдныя інтарэсы беднаты, але і садзейнічалі ўзмацненьню саюзу рабочае клясы і вясковае беднаты з серадняками».

Гэта задача, пастаўлена партыйным зьездам перад усімі партыйнымі арганізацыямі, ПАВІННА БЫЦЬ БЕЗАГАВОРАЧНА І ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАНА. Бо замацаваньне і далейшае разгортваньне калектывізацыі магчыма толькі пры павышэньні пралетарскага кіраўніцтва калектывізацыяй на аснове яшчэ большага замацаваньня саюзу рабочае клясы і беднаты з серадняками вёскі.

Даны пэрыяд сацыялістычнага будаўніцтва патрабуе сярод беднаты не кампанейскай работы, якая праводзіцца ў некаторых арганізацыях ад выпадку да выпадку, а пастаяннай, глыбокай і сыстэматычнай работы, якая-б поўнасьцю забясьпечвала ажыцьцяўленьне асноўных задач партыі па сацыялістычным наступленьні па ўсім фронце. Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі, ліквідацыя кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі патрабуе ПАВЫШЭНЬНЯ ПАЛІТЫЧНА-КЛЯСАВАЙ СЬВЯДОМАСЬЦІ БАТРАЦКА-БЯДНЯЦКІХ МАС ВЁСКІ. Ячэйкі КП(б)Б, разгортваючы клясава-палітычнае выхаваньне мас батракоў і беднаты, павінны няўхільна мабілізаваць іх НА ЯШЧЭ БОЛЬШ УЗМОЦНЕНАЕ НАСТУПЛЕНЬНЕ НА КУЛАЦТВА.

Перад вясковымі партарганізацыямі стаіць рад важнейшых палітычна-гаспадарчых кампаній: збораагазатоўкі, мабілізацыя сродкаў насельніцтва, ільнаагазатоўкі і г. д. Пляны гэтых кампаній будуць выкананы толькі тады, калі партыйныя арганізацыі ў сваёй практычнай рабоце па іх правядзеньні будуць апірацца на актыўнасьць беднаты і калгасьнікаў, калі будуць мабілізаваць іх для далейшага наступленьня на капіталістычныя элементы вёскі.

У першай палове сьнежня месяца па ўсіх раёнах згодна пастановы ЦК КП(б)Б, ПАВІННЫ БЫЦЬ ПРАВЕДЗЕНЫ РАЁННЫЯ НАРАДЫ ГРУП БЕДНАТЫ. На гэтых нарадах, апрача палітычнай пільнасьць калгасьнікаў, дэтальнага і глыбокага растлумачэньня калгасьнікам, беднаце і батрацтву задач партыі па разгортваньні работы сярод іх, павінны быць намечаны канкрэтныя шляхі ўзмацненьня работы батрацка-бядняцкіх груп.

На нарадах павінна быць пастаўлена пытаньне аб задачах батрацтва, беднаты і калгасьнікаў у перавыбарах сельсаветаў. Трэба ім глыбока растлумачыць аб неабходнасьці ўзмацненьня органаў дыктатуры пралетарыяту на вёсцы, аб тым, што навава выбраныя сельсаветы павінны быць цалкам баяздольнымі ў змаганьні за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, за поўную ліквідацыю кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі. Перавыбары сельскіх саветаў будуць адбывацца ў абставінах жорсткага клясавага змаганьня. Капіталістычныя элементы вёсні будуць усякімі мерамі і сродкамі імкнуцца пралезьці ці паспаць «сваіх людзей» у сельсаветы. Таму клясава-палітычная пільнасьць калгасьнікаў, батрацтва і беднаты, замацаваньне іх саюзу з серадняком—зьяўляецца рашаючым момантам у стварэньні баяздольных органаў пралетарскай дыктатуры на вёсцы.

Раённыя партарганізацыі да канфэрэнцыі груп беднаты павінны правесьці шырокую падрыхтоўку. Перш за ўсё павінна быць дэтальна праверана тое, у якім стане знаходзіцца работа сярод беднаты ў раёне, павінны быць выкрыты апартуністыя, якія проста ці ўскосна ігнаруюць разгортваньне работы сярод беднаты.

Раённыя нарады груп беднаты павінны даць зрух у рабоце сярод беднаты, пачынаючы ад якога ўсе райпартарганізацыі, бязьлітасна змагаючыся супроць правых і «левых» апартуністых, будуць па-баявому разгортваць работу сярод батрацтва і беднаты ў адпавед насьці з тымі дырэктывамі, якія даў XVI зьезд УсеКП(б) і XIII зьезд КП(б)Б.

Аб правядзеньні раённых канфэрэнцый батрацка-бядняцкіх груп

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

1. У АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ПАСТАНОЎ БЮРО ЦК КП(б)Б АБ РАБОЦЕ З БЕДНАТОЙ І Ў МЭТАХ ЛЕПШАЙ МАБІЛІЗАЦЫІ МАС БАТРАЦТВА І БЕДНАТЫ НА АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ У ПРАВЯДЗЕНЬНІ ГАСПАДАРЧА - ПАЛІТЫЧНЫХ КАМПАНІЙ І Ў ПРЫВАТНАСЬЦІ СПРАВАЗДАЧНА - ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ САВЕТАЎ, А ТАКСАМА ДЛЯ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ПАСТАНОВЫ ЦК АБ РАБОЦЕ СЯРОД БЕДНАТЫ З ТЫМ, КАВ СТВАРЫЦЬ НЕАБХОДНЫ ПЕРАЛОМ У ГЭТАЙ РАБОЦЕ — ПРАПАНАВАЦЬ РАЙКОМАМ У ПЭРЫЯД З 1 ПА 15 СЬНЕЖНЯ ПРАВЕСЬЦІ ШЫРОКІЯ КАНФЭРЭНЦЫІ БАТРАЦКА - БЯДНЯЦКІХ ГРУП.

2. НА КАНФЭРЭНЦЫЯХ ПРАПАНАВАЦЬ НАСТУПНЫЯ ПЫТАНЬНІ:

а) ЗАДАЧЫ ПАРТЫІ Ў ГАЛІНЕ РАБОТЫ СЯРОД БАТРАЦТВА І БЕДНАТЫ;

б) ПЕРАВЫБАРЫ САВЕТАЎ 1930-31 ГОДУ І ЗАДАЧЫ БАТРАЦТВА, БЕДНАТЫ І КАЛГАСЬНІКАЎ.

3. ЛІЧЫЦЬ НЕАБХОДНЫМ НА КАНФЭРЭНЦЫЯХ, АПРАЧА ЎСІХ БАТРАЦКА - БЯДНЯЦКІХ ГРУП, УДЗЕЛ КАЛГАСЬНІКАЎ. КАЛГАСЬНІКІ ПАВІННЫ ДЭЛЕГАВАЦЦА АД КАЛГАСАЎ У КОЛЬКАСЬЦІ, ЯКАЯ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ВЕЛІЧЫНІ ТАГО ЦІ ІНШАГА КАЛГАСУ (3-6 ДЭЛЕГАТАЎ АД КОЖНАГА КАЛГАСУ).

4. ПРАПАНАВАЦЬ РАЙКОМАМ РАЗГАРНУЦЬ ДАСКАНАЛУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ДА РАЁННЫХ КАНФЭРЭНЦЫЙ З ТЫМ, КАВ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ІХ ПАСЬПЯХОВАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ.

ЦЭНТРАЛЬНЫМ ГАЗЭТАМ НАЛАДЗІЦЬ ШЫРОКАЕ АСЬВЯТЛЕНЬНЕ ЎСЕЙ ПАДРЫХТОЎЧАЙ РАБОТЫ ДА КАНФЭРЭНЦЫІ І ІХ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ.

ЗА САКРАТАРА ЦК КП(б)Б
ГАНТМАН.

Зруху няма

У пачатку бягучага году было зьменена кіраўніцтва Лёзьнянскай раённай партарганізацыі за апартуністычную недаацэнку работы з беднатой. Аднак, гэта арганізацыйнае мерапрыемства ня ўнесла належнага зруху ў работу парт'ячэек па арганізацыі беднаты на выкананьне галоўнейшых задач партыі на вёсцы. Работа з беднатой зьяўляецца самым слабым месцам і дагэтуль. У радзе парт'ячэек распаўсюджаны настроі, што «зараз работу з беднатой праводзіць няма ніякай патрэбы, бо агульныя сходы сялян і без папярэдняй работы з беднатой прахо-дзяць добра». Гэтыя права-апартуністычныя разважаньні, якія змазваюць наяўнасьць кулацкай небясьпекі ў вёсцы, не сустракаюць рашучага адпору з боку ячэек.

Праведзеным абсьледваньнем стану работы з беднатой і батрацтвам выяўлена, што дырэктывы партыі па гэтым пытаньні груба скажаліся большасьцю ячэек. Райком КП(б)Б зараз вызначыў рад канкрэтных мерапрыемстваў у справе разгортваньня работы з беднатой і мабілізацыі яе на выкананьне галоўнейшых задач партыі па калектывізацыі сельскае гаспадаркі. **Казіміровіч.**

Зводка барацьбы за прамфінплян

Выкананьне пляну лепшы адказ інтэрвэнтам

КАЛІ ПАЧНЕМ ПРАЦАВАЦЬ БЕЗ ПЕРАБОЯЎ

У мінулым годзе ВІЦЕБСКАЯ АБУТКОВАЯ ФАБРЫКА працавала з вялікімі перабоямі. Страты ад прастояў склаюць дзесяткі тысяч рублёў. Апрача гэтага праграма за мінулы год выкананa ўсяго на 85 проц.

ЗАРАЗ ПАЎТАРАЕЦЦА ЛЕТАШНЯЕ. 20 лістапада фабрыка працавала з перабоямі, 21 лістапада фабрыка зусім спыніла работу, 22 і 23 — зноў перабоі, 24 — спыніла работу канчаткова... На фабрыцы — 1.300 чал., сярэдні заработак — 92 рублі ў месяц. Можна лёгка сабе ўявіць, КОЛЬКІ КАШТУЮЦЬ ФАБРЫЦЫ ГЭТЫЯ ЧАСТЫЯ ПРАСТОІ. Такім чынам, прамфінплян ударнага кварталу ТАКСАМА СТАІЦЬ ПАД ПАГРОЗАЙ.

Прычына прастояў у незабесьпячэньні фабрыкі электраэнэргіяй. Трэба прыняць рашучыя меры, каб папрыняць становішча на фабрыцы.

Ш—о.

ВЫНІКІ АПАРТУНІСТЫЧНАГА КІРАЎНІЦТВА

Галоўны эканамісты Бепшвэйаб'яднаньня абсьледаваў становішча фабрыкі імя Дзяржынскага ў Бабруйску. Вынікі абсьледваньня гавораць аб тым, што невыкананьне прамфінпляну і рад іншых буйных недахопаў на фабрыцы тлумачацца апартуністычна - поўтрацкісцкай лініяй у рабоце кіраўніцтва фабрыкі. Няскончаная прадукцыя расьце з кожным днём. На 1 кастрычніка было няскончаных штаноў 7.600 пар, на 1 лістапада—19.800. пар, на 20 лістапада—20.532 пары. Няскончаных прагумаваных польтаў—каля 2.080 штук. У сувязі з невыкананьнем пляну на фабрыцы сабраўся запас сырцу, які ў 7 раз перавышае ўсю прадукцыю, зробленую за 21 дзень лістапада. Якасьць прадукцыі зусім нездавальняючая. Пераробкі дасягаюць 27 проц., ня лічачы швэйнага і тэкстыльнага браку. Колькасьць рабочай сілы перавышае планавае намячэньне НА 21 ПРОЦ. Нявыхад на работу і прагулы растуць з кожным днём. У жніўні нявыхады на работу складалі 7,36 проц., у верасьні —9,57 проц., у кастрычніку—10,87%. Прагулы па наўважлівых прычынах: у жніўні—0,26 проц., у верасьні—0,37 проц., у кастрычніку—0,42 проц. За 5 месяцаў (май-кастрычнік) было звольнена 203 чал. і прынята 399, пры сярэдняй колькасьці рабочых каля 900 чал. У той-жа час ніякай барацьбы з цякучасьцю рабсілы не вядзецца. Масавая партыйная і прафсаюзная работа на фабрыцы пастаўлена вельмі слаба.

Бепшэйаб'яднаньне, ЯКОЕ ТАКСАМА ВІНАВАТА Ў НЕПАРАДКАХ НА БАБРУЙСКАЙ ФАБРЫЦЫ, павінна да памагчы кіраўніцтву гэтай фабрыкі зьнішчыць памылкі і недахопы.

ПРАЦУЮЦЬ ДОБРА

Фабрыка цукерак «Камунарка» ў кастрычніку выканала праграму параўнальна з верасьнем на 121,7 проц. і выканала плянавае заданьне на 110,1 проц.

За 15 дзён лістапада плянавае заданьне выканана на 120,2 проц.

Прадукцыйнасьць працы за кастрычнік павялічана на 70 проц.: заданьне перавыкананa на 18 проц. Прагулы зьменшыліся ў два разы: у верасьні яны складалі 0,04 проц., за кастрычнік —0,02 проц.

Па-бальшавіцку правядзем студзеньскі набор у ВНУ

Замест кучкі інтэрвэнтаў, контр-рэвалюцыянэраў—шкоднікаў дамо Савецкай краіне новыя батальёны пралетарскіх спэцыялістых

Факультэт да прыёму гатоў

Гіганцкія тэмпы разьвіцьця нашае сацыялістычнае гаспадаркі патрабуюць напружанай работы і барацьбы за аўладаньне камандным вышынямі ва ўсіх галінах народнае гаспадаркі. Яны патрабуюць даць, як мага хутчэй, нашай пармысловасьці, сельскай гаспадарцы, плянавым і фінанасавым органам, каапэрацыі сапраўдных пралетарскіх спэцыялістых узброеных ведамі, добра падрыхтаваных палітычна.

Мы павінны паглыбіць наша змаганьне за кадры з нетрэй рабочых, батракоў, калгасьнікаў беднаты і лепшай часткі серадняцтва вёскі.

Факультэт Народнае гаспадаркі БДУ рыхтуе эканамістых-інжынэраў, эканамістых-фінансістых, плянавікоў, каапэратараў, таваразнаўцаў, эканамістых-арганізатараў калгасаў і саўгасаў і высокакваліфікаваных работнікаў паасобных галін вытворчай сельска - гаспадарчай каапэрацыі. Гэта той кадр чырвоных камандзіраў народнае гаспадаркі, які найбольш патрэбны сацыялістычнай дзяржаве.

Роля эканаміста-плянавіка ўзьнімаецца асабліва тады. калі ім усьвядомлена значэньне пляну, калі ён умее, паводле дырэктыў партыі і ўраду будаваць яго і праводзіць у жыцьцё. Няўменьне правільна пабудаваць плян, бяз аналізу даных, няўменьне кіраваць рэгулятыўнай ідэяй пры пабудове пляну сацыялістычнага будаўніцтва будзе межаваца са шкодніцтвам.

Што мы маем зараз на факультэце?

Са складу студэнцтва ў 495 асоб—60 проц. рабочых, 17 проц.—сялян і 23 проц.—служачых. Партыйна-камсамольская праслойка факультэту даходзіць да 60 проц. Па нацыянальным складзе: беларусаў—57 проц., яўрэяў—38 проц., палякаў, расійцаў і інш.—5 проц.

Факультэт забясьпечаны стыпэндыямі на 70 проц., а 1-шы курс асэньнята набору—на 85 проц. Горш справа з інтэрнатам.

Факультэт забясьпечаны габінэтамі і падручнікамі. Сярод выкладчыкаў ёсьць каля 20 проц. інжынэраў па розных галінах і спэцыяльнасьцях, да 10 прафэсараў, каля 40 дацэнтаў і 15 асыстэнтаў. Навуковы плян факультэту на 75 проц. прапрацоўваецца актыўным метадам. 40 проц. навучальнага пляну адведзена вытворчаму навучаньню: студэнт з 1 курсу праходзіць вытворчую практыку па сваёй спэцыяльнасьці.

Студэнцтва на 90 проц. ахоплена сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам. У гэтай частцы работы мы амаль што выканалі дырэктывы лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) у галіне падрыхтоўкі кадраў эканамістых.

Перад факультэтам і партыйнымі і грамадзкімі арганізацыямі БОСР стаіць пяпер вялізарная задача. На факультэт народнае гаспадаркі ў зімовы прыём трэба ўліць 160 новых пралетараў гораду і вёскі. Трэба прыняць на прамысловае аддзяленьне 40 асоб, на сельска-гаспадарчае—40 асоб, плянавае—30 і фінансавае—40.

Падбор і насылка лепшых таварышоў у сацыяльна-эканамічную ВНУ будзе зарукою таго, што наша сацыялістычная гаспадарка праз 3-3½ гады атрымае добра падрыхтаваных, марксыцка-ўзброеных чырвоных спэцыялістых.

Пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, у барацьбе за яе адзінства, у барацьбе за лепшае па якасьці, больш значныя на колькасьці, пралетарскія кадры факультэт ідзе да новых перамог.

А. ГУРЛО.

Наладзіць практыку студэнта Камвузу

Па-заўнівэрсытэцкая практыка студэнтаў зьяўляецца арганічнай часткай усёй сыстэмы іх вучобы ў Камвузе. Асабліва значэньне набывае належная пастаноўка практыкі студэнтаў у гэтым навучальным годзе, у зьвязку з рэарганізацыяй Камвузу па прынцыпе аддзяленьняў.

Пэрыяд рэканструкцыі народнае гаспадаркі патрабуе высококваліфікаваных партыйных работнікаў. Гэткіх работнікаў, якія сапраўды адпавядалі-б задачам цяперашняга часу, Камвуз зможа даць, калі па-заўнівэрсытэцкая практыка студэнтаў будзе цьмільна ўвязана з усёй праграмай навучаньня.

Асноўная мэта па-заўнівэрсытэцкай практыкі — уніканьне магчымасьцяй адрыву студэнтаў ад асноўнага партыйнага рабочага ядра і ад беспартыйных мас.

Частка студэнтаў, якія прыходзяць у Камвуз, зусім незнаёма з работай і жыцьцём заводзкіх партарганізацый, рабочых. Ім трэба за час прабываньня ў Камвузе, як мага шчыльней зьвязацца з рабочымі масамі.

Студэнты павінны ўсебакова вывучыць жыцьцё прадпрыемства, каб набыць вопыт партыйнай, савецкай і прапагандысцкай работы ў канкрэтных, зьменных умовах.

Практыка павінна ўстанавіць сталую сувязь пралетарскага студэнцтва з масамі і ўвязаць яго тэарэтычную вучобу са штодзённым вопытам сацыялістычнага будаўніцтва, з чарговымі задачамі і бягучай палітыкай партыі.

Адным з асноўных недахопаў у пастаноўцы практыкі студэнтаў зьяўляецца слабы ўдзел у ёй райкомаў КП(б)Б і партыйных ячэек, да якіх прымацаваны студэнты. Партарганізацыі на мясцох часта забываюць, што іх абавязак—дапамагчы Камвузу і самім студэнтам у справе падрыхтоўкі будучых падрыхтаваных партработнікаў.

На прадпрыемствах студэнтаў скарыстоўваюць вузка - ўцілітарскі. Напрыклад, ёсьць факты, калі студэнтаў вылучаюць у заводзкія брыгады па абсьледваньні паркамату, або для сьвятленьня выпадкаў п'янства з рабочага — члена партыі (завод «Б... шавік»).

На абутковай фабрыцы, з прычыны прарыву, зусім забыліся пра студэнтаў і тыя пакуль што «адпачываюць». Відавочна, што бюро парткалектыву здолела скарыстаць студэнтаў Камвузу прыцягваючы іх на дапамогу і ліквідацыю прарываў.

На заводзе «Энэргія» трымаюцца такой думкі: частка рабочых займаецца ўвечары ў тэхнікуме, а таму для правядзеньня грамадзкай работы іх трэба замяніць студэнтамі, прымацаванымі да іх ячэйкі. Студэнты прымацаваны, але пакуль што нічога ня робяць.

На заводах «Кастрычнік», «Камунар» і на інш. прадпрыемствах сакратары партыйных калектываў наогул ня ведаюць, як скарыстаць студэнтаў.

Побач з гэтым наглядаецца зусім дрэнныя адносіны да практыкі і з боку часткі саміх студэнтаў. Пэўная катэгорыя студэнтаў хварэе на акадэмізм. Яны ўдзень і ўночы сядзяць над кнігамі, — гэтыя бескарысныя начотчыкі ад марксызму - ленінізму, якія ня ўмеюць арыентавацца ў канкрэтных умовах работы.

Ёсьць, таксама, катэгорыі студэнтаў, якія недаацэньваюць насьўна адносіны да практыкі, і ў якіх работа заканчваецца толькі ў наведваньні сходаў.

З гэтымі неадаровымі зьявішчамі і настроямі сярод студэнцтва трэба павесьці рашучую барацьбу.

Райкомы і парт'ячэйкі павінны пазьвярнуцца ў бок наладжваньня практыкі студэнтаў Камвузу. Трэба ўстанавіць больш чулае кіраўніцтва і таварыскія адносіны да камвузаўцаў.

Тады будзе метазгодным і неабходным даць студэнтам на практыку на 8 гадзін у дэкаду, а мінімум 32 гадзіны ў месяц. У той-жа час трэба скампэнсаваць гэту практыку ў 4-5 дзён, а такім разьлікам, каб студэнты ў гэтыя дні працавалі выключна на практыцы.

Гушман.

Тэхнікум ня выконвае сваіх задач

Ст. Барысаўскі тэхнікум, які знаходзіцца пад ведамам Наркамзему СССР і Сьвінатрэсту, рыхтуе тэхнікаў-сьвіноводаў. Але-ж ці зацікавіўся хто з кіруючых органаў становішчам у ст. Барысаўскім с.-г. тэхнікуме? Мусіць не. Менск думае, што гэтым павінна цікавіцца Масква, а Масква, напэўна, думае, што Менск.

Навучальныя памяшканьні не адрамантаваны, за выключэньнем аднаёй лябараторыі, у якой падвялікім націскам асьветнікаў пачаты з вялікім спазьненьнем рамонт. Дзякуючы адсутнасьці рамонту, сарваны асеньні прыём 80-ці асоб, тым часам, рад кватэр тэхнікуму займаецца зусім стороннімі асобамі.

Лябараторыі тэхнікуму некалькі год ня белены, у іх пануе бруд, холад і нільгаць; з пачатку навучальнага году лябараторыі не апіраліся на працягу больш 1½ месяцаў і зараз таксама дроў у тэхнікуме няма. Аб дровах пачалі клапаціцца толькі ў канцы кастрычніка (праўда, паперку паслалі ў НКА ў маі месяцы). Зараз, з прычыны сьцюжы, хварэюць да 30 проц. студэнтаў і 60 проц. выкладчыкаў.

Электрастанцыя з мая «рамэнтуецца» і сьвятла няма. Адміністрацыя тэхнікуму ня ўжыла ніякіх захадаў для паскарэньня рамонту, у выніку чаго сарваны тысячы вучэбных гадзін і ўся ПАЗАШКОЛЬНАЯ ПРАЦА.

Санітарныя ўмовы тэхнікуму з рук вон дрэнныя: вады няма, уборных каля галоўнага корпусу—таксама.

Бюджэт тэхнікуму злачынна не выкарыстаны, некалькі соцень рублёў зьвернуты ў прыбытак дзяржавы, у той час, як дырэктар тлумачыць усе гаспадарчыя прарывы адсутнасьцю сродкаў і рабочай сілы. (*).

У навучальнай частцы—поўны хаос і самацёк. Сталых раскладаў заняткаў да гэтага часу няма. Невядома, калі скончыцца той ці іншы цыкл прадметаў, які пачнецца і г. д. Па скончэньні дысцыплін некаторыя выкладчыкі застануцца бяз працы, бо расклад ня ўвязаны. Вязгуздае кіраўніцтва загалчыка навучальнае часткі В. І. Кусткова вядзе да поўнага прагалу падрыхтоўкі.

Настаўніцкі калектыў ня раз ставіў на вытворчых парадах і агульных сходах пытаньне аб прарывах і недахопах, імкнучыся агульнымі сіламі іх зжыць, але-ж дзякуючы таму, што дырэктар бюракратычна—груба ігнаруе ініцыятыву асьветнікаў у справе ўдзелу ў вытворчым жыцьці—гэта зрывалася.

Самакрытыка заціснута. На спробы студэнтаў і настаўнікаў, якія жадаюць дапамагчы справе, дырэктар звычайна адказвае:

— Прашу дырэктару ня ўказваць!

ці:

— «ня ваша справа»!

Мясцком ня разу рашуча не паставіў пытаньня аб зьнішчэньні прарываў, сакратар апартуністычна-прымірэнчымі адносінамі да адміністрацыі змазвае гэтыя вострыя пытаньні.

Асьветнік.

М. ЮГАЎ

Вялікадзяржаўная кантрабанда пад сьцягам беларускага нацыяналізму

Адзін з беларускіх нацыяналістычных «дзеячоў», Цьвікевіч А. былы міністар (і нават прэм'ер) контр-рэвалюцыйных буржуазна-нацыяналістычных урадаў напісаў і пры садзейнасьці ранейшага нацыянал-апартуністычнага кіраўніцтва Беддзяржвыдавецтва надрукаваў кнігу «Западно-русизм».

Гэта кніга зьяўляецца настолькі дасканалай на самавыкрыцьці беларускага нацыяналізму, што, калі-б не прынцыповая немагчымасьць для савецкіх органаў распаўсюджваць, ды яшчэ пад маркай Дзяржвыдавецтва, чорнасоценную літаратуру, не варта было-б выпускіць на кніжны рынак.

Кніга гэта ўжо пасьля надрукаваньня была канфіскавана. Тым ня менш кніга патрабуе разгляду, хаця-б ужо таму, што часткова, у выглядзе паасобных артыкулаў, друкаваных у «Полымі», у форме акадэмічнага абмеркаваньня асобных разьдзелаў у інстытуце гісторыі Беларускай Акадэміі Навук, зьмест і ідэі гэтай кнігі прасякнулі ў поўнымі колы.

У чым-жа сэнс гэтай кнігі «Западно-русизм»? Коратка кажучы, у спробе ўстанавіць пераемнасьць і адзінства ў разьвіцьці беларускай нацыянальнай ідэі, пачынаючы ад мацёрых расійскіх прыгоньнікаў, іх агентаў, і канчаючы сёньняшнім днём.

Рэакцыйнасьць гэтае спробы, амаль што адзіная ў сваім родзе ў буржуазна-нацыяналістычнай літаратуры ўсіх народаў СССР, тлумачыцца поўнасьцю завостранай клясава - варожай пазыцыяй аўтара, хаця трэба ўказаць яшчэ, што аўтар гэтае вялізарнае (у 340 старонак) працы выключны невук. Падрабязны разгляд гэтай кнігі мы зробім у «Бальшавіку Беларусі», тут-жа мы хочам у некалькіх словах азнаёміць чытача «Зьвязды» з гэтай надзвычайнай кнігай.

Як вядома, беларускі нацыянальны рух праявіўся, у сувязі з агульнымі гістарычнымі ўмовамі разьвіцьця народу, даволі позна. Але і ў самых раньніх сваіх праяўленьнях, як і пазьней, у пачатку XX стагодзьдзя, ён ніколі ня быў зьвязан з прыгоньніцкімі тэорыямі і партыямі. Ян Чачот, Дунін - Марцінкевіч, Кастусь Каліноўскі, Францішак Багушэвіч знаходзіліся пад уплывам польскага радыкальна-апазыцыйнага руху. Гэты рух, нават у сваім правым, буйна-буржуазным крыле, ня гледзячы на клясава - абмежаваны характар, зьяўляўся ў агульным і цэлым рухам прагрэсыўным, у сваёй дробна - буржуазнай часьці гэты рух зьяўляўся бязумоўна рэвалюцыйным. Маркс, выходзячы з палажэньня, цалкам акрэсьліваўшага для яго адносіны да ўсіх эўрапейскіх спраў, іменна з таго, што расійскі царызм зьяўляецца галоўным ворагам усяго вызваленчага і рэвалюцыйнага руху ў Эўропе, надзвычай станоўча адносіўся да польскага руху, у прыватнасьці да польскага паўстаньня 1863 году, увесь час падкрэсьліваючы ўсю палавінчасьць, невыстарчальнасьць рамяньняў, нават левых, рэзка крытыкуючы буржуазную лінію паводзін. Як вядома, гэтыя погляды Маркса цалкам падзяляліся і Леніным: «Тады, — пісаў Ленін, — рэвалюцыйнаю была іменна Польшча ў цэлым, ня толькі сялянства, але і маса дваранства. Тады поўная перамога дэмакратыі ў Эўропе была сапраўды немагчыма без аднаўленьня Польшчы. Тады Польшча была сапраўды аплотам цывілізацыі супроць царызму, перадавым атрадам дэмакратыі».

Другая лінія сувязі беларускага нацыянальнага руху штурхала не прадстаўнікоў да расійскага вызваленчага руху. Той-жа Кастусь Каліноўскі меў адносіны да пецярбурскіх рэвалюцыйных гурткоў, праўда, далёка ня самых крайніх і насьлядоўна - рэвалюцыйных, у 80 гадох выходзіць «Гомон», які праводзіў у масы ідэі «Народной Воли», у пачатку XX стагодзьдзя беларускія дробна-буржуазныя рэвалюцыйныя групы ўскладаюць усе свае надзеі на расійскі вызваленчы рух. Мы ня лічым патрэбным тут указваць на невыстарчальную рэвалюцыйнасьць практыкі і тэорыі ўсіх гэтых асоб, груп, руху, падкрэсьліваць наяўнасьць буржуазных, нацыяналістычных элемэнтаў у іх праграме і дзейнасьці. Мы зараз ня будзем спыняцца і на тым гісторыяй ужо выраша-ным, пытаньні, што толькі пралетарская рэвалюцыя аказалася ў стане даць мільённым масам раней прынечаных расійскім царызмам нацыянальнасьцяй сапраўднае нацыянальнае вызваленьне, поўнасьцю вызваліць ад каляніяльнай залежнасьці. Мы хочам толькі ўказаць, што беларускі нацыянальна - вызваленчы рух*), заўсёды ўскладаў свае надзеі на польскі ці расійскі рэвалюцыйна - вызваленчы рух.

Гэта і зразумела. Калі паўднёва-славянскія народы, якія стагналі пад ярмом турэцкага фэадалізму, і маглі ўскладаць нейкія цьмяныя надзеі на расійскую імпэрыю (Маркс, як вядома, лічыў гэтыя рухі, паколькі яны арыентуюцца на расійскі царызм, рэакцыйнымі), дык беларускія народныя масы, якія на сабе адчувалі ўсю прыгожасьць прыгоньніцкай лапы царызму, у сваім сьвядомым руху да нацыянальнага вызваленьня ўсе свае надзеі маглі ўскладаць толькі на ўлад царызму. Буйное расійскае зямляўладаньне, як і буйное польскае зямляўладаньне, аднолькава імкнуліся пазбавіць беларускага селяніна права на беларускую мову, беларускую гісторыю, аднолькава імкнуліся абкрыўдзіць яго ў «быдла», у жывы інвэнтар польскага (і беларускага палёнізаванага) або расійскага (і беларуска - русыфікаванага) буйнога памешчыцкага маёнтку. Але на старане буйнога расійскага зямляўладаньня знаходзіўся магутны дзяржаўны апарат, які награжаў цэлай сыстэмай рэпрэсій нацыянальнаму існаваньню ня толькі беларускага, але і непамерна больш моцнага культурна, эканамічна і палітычна, польскага народу. Вось чаму стварылася на першых часох — у барацьбе з русыфікатарскай палітыкай прыгоньніцкага царызму — больш цесная сувязь паміж прадстаўнікамі апазыцыйнага беларускага пляхецтва і шляхецкай інтэлігенцыі з польскімі апазыцыйнымі коламі. Гэта вымушан прызнаць і Цьвікевіч:

«Польшча... (ніякіх клясаў у яго няма, гутарка ўвесь час ў Цьвікевіча ідзе аб барацьбе адзінай Польшчы і Расіі)... не хацела аддаць Беларусь Расіі — і таму адзіным выхадам заставалася прызнаньне Беларусі, як самастойнай краіны. Вось чаму мы бачым, што большасьць беларускіх адраджэнцаў таго часу выходзіла з пэрагаў мясцовае інтэлігенцыі польскай культуры».

Тут ён вымушан прызнаць, уступаючы буржуазным і дробна - буржуазным нацыяналістычным канцэпцыям, адну з крыніц «беларускай нацыянальнай ідэі». Але ён знаходзіць і другую, ня менш важную, крыніцу і сярод так званых беларусаў расійскай культуры. Гэтай крыніцай аказваюцца... «западно-руссы».

Як усім вядома западно-русизм» гэта казённакоштная, паліцэйска - духоўная тэорыя, даказваўшая, што ніякага самастойнага беларускага народу няма, ёсьць толькі мясцовы дыялект, мясцовыя асаблівасьці. «Западно-русизм» падкрэсьліваў наяўнасьць гэтых мясцовых асаблівасьцяй толькі ў тэй меры, у якой гэта неабходна было расійскаму прыгоньніцтву для змаганьня з польскім уплывам у культуры, эканоміцы, палітыцы краю. Калі польскі апазыцыйны і рэвалюцыйны рух пагражаў тэрытарыяльнай і палітычнай цэласьці царыцкай імпэрыі, тады «западно - русизм» станавіўся тэй пэдалай, націскам на якую перадавалася ў масы тая тактыка сацыяльнай дэмагогіі, да якое вымушаны былі зварочвацца расійскія паны: нацкоўваньне беларускіх сялян на польскіх паноў. Гэта небясьпечная і для расійскага буйнога зямляўладаньня гульня на сацыяльных інстынктах масы дапускалася толькі на вельмі невялікі адрэзак часу (пэрыяд, напрыклад, мураўёўшчыны — 1863—1867 г. г.) і строга рэгулявалася царызмам.

«Западно - руссы» і ўся іх ідэалёгія і ў гэтай гульні выступалі простай службовай сілай царызму і расійскага прыгоньніцтва: выступаючы супроць буйнога польскага зямляўладаньня, яны спрыялі насаджэньню ў краіне буйнога расійскага зямляўладаньня. Іменна іх і разглядае Цьвікевіч, як крыніцу «беларускай нацыянальнай ідэі». Ён ня можа проста адкінуць факт іх поўнага і бязумоўнага падпадраджаньня вялікарускаму памешчыку і расійскаму цару, таму ён канстатуе недарэчнейшую тэорыю аб «дзьвёх душах» у «западно-руссизме» — адна цягнула іх да фэтышызаваньня імпэрыі, другая-ж, моў, прымушала іх займацца беларускай этнаграфіяй, гісторыяй і г. д. А этнаграфічны інтарэс, выстаўляе ён далей тэзіс, перарастаў у нацыянальны рух.

Цьвікевіч прабуе гэта паказаць на дзейнасьці... Гаворскага, Каяловіча, Сапунова. Усіх гэтых трох дзеячоў «западно - руссизма» Цьвікевіч прадстаўляе, як абаронцаў інтарэсаў дробнай буржуазіі, абаронцаў дробнай зямельнай уласнасьці. Пра Гаворскага, рэдактара духоўна - чыноўніцкай газэты, у літаральным сэнсе слова паліцэйскага літаратара,

У адказ інтэрвэнтам перавыканаем збожжазагатоўчыя пляны

Баявой падрыхтоўкай да другой калгаснай вясны, пашырэньнем калгаснага руху—

адкажам на замахі інтэрвэнтаў і іх агентаў—Рамзіных, Ларычавых, контр-рэвалюцыянэраў—беларускіх нацыянал-дэмакратаў Ластоўскіх, Смолічаў, Цьвікевічаў і іншых

БССР яшчэ ня рыхтуецца да вясны

Плян рамонту ня складзены

Апошні тыдзень ня ўнёс ніякіх зьмен у прасоўваньне на месцы плянаў веснавой сяўбы. Спрэчкі паміж раёнамі і Наркамзэмам адносна кантрольных лічбаў пашырэньня яравога кліну працягваюцца. Рад раёнаў усё яшчэ дамагаюцца на зьмяншэньне заданьняў, нават сур'ёзна іх не абмяркоўваючы.

У выніку, распрацоўка плянаў веснавой сяўбы яшчэ раёнам не распачата. Аб прасоўваньні кантрольных лічбаў у сельсаветы пакуль і гутаркі няма.

Аналёгічны малюнак і з засыпкай насенных фондаў у новых калгасах, асабліва дэфіцытных тэхнічных і карманых культур. У пераважнай большасьці калгасаў да гэтай справы ня прыступлена.

Фактычна яшчэ не распачата работа ня толькі у раёнах, але нават і ў цэнтры па арганізацыі рамонту трактараў, машын і с.-г. інвэнтару. Характэрна, што плян Белсельгасснабут ўжо 2 тыдні марынуецца ў НКЗ БССР. Зацягваньне яго разгляду і зацьверджаньня затрымлівае арганізацыю рамонту па пінні Белсельгасснабу. Да сёньняшняга дня яшчэ не прадставілі ў НКЗ сваіх плянаў рамонту Белсельтрэст і Трактара цэнтр.

Недаацэнка сваячасовай арганізацыі рамонту тым больш недапушчальна, калі улічыць, што значная частка складаных машын і трактараў патрабуе капітальнага рамонту. Да рэчы, нельга пачаць рамонту трактараў з-за адсутнасьці запасных частак да іх. Адсутнасьць пляну рамонту яшчэ больш ускладняе пытаньне забесьпячэньня БССР запаснымі часткамі. Зацягваньне рамонту не дае, таксама, магчымасьці перакінуць частку трактараў на песаспрацоўкі.

Непрабудная сьпячка наглядаецца на мясцох. Будаўніцтва 15 звычайных і 3-х складаных майстэрань сарвана. Ні НКЗ, ні ВСНГ ня прымаюць рэальных мер, каб неадкладна скончыць абставаньне гэтых майстэрань.

Наркамзем нічога пакуль што канкрэтнага не зрабіў, каб арганізаваць курсы па падрыхтоўцы токараў і перакваліфікацыі рамонтных рабочых.

АДКАЗ СІРОЦІНЦАЎ

СІРОЦІНА. (ПОСТ. «ЗЬВЯЗДЫ»). У АДКАЗ НА СПРОБЫ ЗАМЕЖНАЙ БУРЖУАЗІІ АРГАНІЗАВАЦЬ ІНТЭРВЭНЦЫЮ НА САВЕЦКІ САЮЗ, БЕДНЯКІ І СЕРАДНЯКІ ВЁСКІ ЗАЛЕСЬСК АРГАНІЗАВАЛІСЯ Ў КАЛГАС «КРАІНА САВЕТАЎ».

ВЁСКА. КУРАКІ АБ'ЯДНАЛІСЯ Ў КАЛЕКТЫЎ ІМЯ ТАВ. ВАРАШЫЛАВА.

НОВЫЯ КАЛГАСЬНІКІ АРГАНІЗАВАЛІ ЧЫРВОНЫ АВОЗ З БУЛЬБАЙ.

С. РУЖ.

4 калгасы за апошні час

ПОЛАЦАК (Пост «Зьвязды»). У тых сельсаветах, дзе партыйныя ячэйкі разгарнулі масавую работу, добра скарыстаўшы гаспадарчыя посьпехі калгасаў для папулярызацыі пераваг калектыўнае гаспадаркі, адзначаецца шырокая калгасная хваля.

Так, у Гарбаціцкім сельсавеце (Вульскі раён) арганізаваўся новы калгас, які аб'яднаў 30 двароў. У калгас «Цукунфт» падана шмат заяў.

У в. Верхачэньне I (Полацкі раён) 26 двароў аб'ядналіся ў калгас «Чырвоны партызан».

10 двароў в. в. Баркі, Шахтовічы 1 і II арганізавалі свой калгас «Чырвоны сьцяг».

12 бядняцка-сераднякцкіх гаспадарак в. Зюзіна аб'ядналіся ў калгас «Ударнік».

Новы прыліў

ЛАГОЙСК (Пост «Зьвязды»). За апошні час, у выніку справаздачнай кампаніі калгасаў перад адзінасобнікамі, узмацніўся калгасны прыліў. У раёне арганізавана 5 новых калгасаў, якія аб'ядналі 124 двары. У адказ на змову контр-рэвалюцыйнай «прампартыі», адзінасобнікі бедняк і сераднякі Янушкавіцкага сельсавету арганізавалі 3 калгасы.

П.

126

ПЛЕШЧАНІЦЫ (Пост «Зьвязды»). Ісьняхова праведзеная калгасамі еньняя пасеўная кампанія і ўдарная бота лепшых калгасаў выклікалі савае ўступленьне адзінасобнікаў калектывы. Так, у калгасы Зарэцка сельсавету ўступіла 126 двароў. Склад калгасаў павялічыўся на 52,5 проц. за апошні час.

ВЫНІКІ

3-ці усебеларускага зьезду МОПР'у

III ўсебеларускі зьезд МОПР'у ўчора скончыў сваю работу. Мінулы склад ЦК МОПР'у не перавёў сваю работу на новыя формы і мэтады. Адсутнасьць належнага віраўніцтва і жывой сувязі з нізавымі мопраўскімі арганізацыямі дала ня значнага аслабленьня работы нізавых арганізацый ва ўсіх галінах работы. З мэтай ажыўленьня ўсёй мопраўскай работы, зьезд вырашыў рад вельмі важных пытаньняў, якія павінны быць пакладзены ў аснову далейшай работы МОПР'у.

Перавесьці работу МОПР'у на новыя формы і мэтады, прыстасоўваючыся да ўмоў рэканструкцыйнага пэрыяду, шляхам арганізацыі мопраўскіх ударных брыгад на вытворчасьці, у калгасах і саўгасах, цэхавых і зьменных мопраўскіх ячэек і далейшага разгортваньня сацспаборніцтва — вось далейшыя задачы, на якія павінны зьвярнуць увагу ячэйкі.

Зьезд з усёй рашучасьцю асудзіў погляды часткі мопрактыку быццам мопраўскія арганізацыі не павінны прымаць удзелу ў сацыялістычным будаўніцтве. Гэтыя погляды зьезд ацаніў, як апартуністычныя праявы ў практычнай рабоце МОПР'у, бо толькі па меры разгортваньня інтэрнацыянальнай работы і ўдзелу МОПР'у ў сацбудаўніцтве можна будзе меркаваць аб працаздольнасьці тэй ці іншай арганізацыі.

Уся інтэрнацыянальна-выхаваўчая работа павінна ўвайсьці ў сыстэму штодзённай работы мопраўскіх ячэек. Зьезд адзначыў, што частка мопраўскіх арганізацый недаацэньвала важнасьці ролі МОПР'у ў змаганьні з вялікага-дзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, а контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі розных колераў, — заклікаў усю мопраўскую грамадзкасьць БССР змагацца за чыстату ленінскай нацыянальнай палітыкі. Адначасова зьезд даручыў новаму складу ЦК МОПР'у паставіць пытаньне перад ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ аб непасрэднай і актыўнай дапамозе з боку прафэсыянальных і камсамольскіх арганізацый у рабоце нізавых арганізацый МОПР'у і асабліва ў галіне інтэрнацыянальнага выхаваньня працоўных, бо да гэтага часу ўдзел вышэйпаказаных арганізацый у рабоце МОПР'у амаль што адсутнічаў.

З мэтай хутчэйшай ліквідацыі фінансавага прарыву (з-за чаго беларуская арганізацыя залічана на чорную дошку) зьезд пастанавіў на працягу сьнежня месяца правесьці ўдарны месячнік ліквідацыі фінансавага прарыву на базе разгортваньня шырокай масава-выхаваўчай работы.

Зьезд прапанаваў ячэйкам і райкомам ня зьмяшаць з парадку дня шырокай растлумачальнай і агітацыйнай работы па ўцягненьні ўсіх 100 проц. рабочых калгасьнікаў, саўгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў у рады МОПР'у.

Улічваючы важнасьць узмацненьня работы вясковых мопраўскіх арганізацый, зьезд прапанаваў гарадзкім ячэйкам узмацніць шэфства над калгаснымі і саўгаснымі ячэйкамі МОПР'у. Шляхам арганізацыі спэцыяльнага сэктару па шэфстве над палітзьняволенымі, пры ЦК павінна быць узмоцнена шэфства над змагарамі рэвалюцыі.

З мэтай падрыхтоўкі кадраў для нізавых мопрарганізацый, зьезд прапанаваў ЦК прыступіць да ўкамплектаваньня кароткатэрміновых курсаў.

Усе пастановы трэцяга ўсебеларускага зьезду МОПР'у могуць быць ажыцьцёўлены толькі шляхам адчуваньня пэрсанальнай адказнасьці кожнага мопраўца за даручаную яму работу.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

66,2% ГАДАВОГА ЗАДАНЬНЯ—ВЫНІК АПАРТУНІСТЫЧНАЙ ПРАКТЫКІ У ЗАГАТОЎКАХ

Ударнай работай разаб'ем спробы правых і „левых" апартуністых сарваць пляны

ПРЫМУСІМ КУЛАКА ЗДАЦЬ ЛІШКІ! САМЫЯ СУРОВЫЯ РЭПРЭСІІ ДА ТЫХ, ХТО ЗАТРЫМЛІВАЕ ЗБОЖЖА, ХТО САБАТУЕ ВЫКАНАНЬНЕ ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯЎ!

За 100 проц. пляну да 10-га сьнежня

Даныя аб ходзе збожжазагатовак па БССР на 25 лістапада (паводле вестак Саюзхлеба) сьведчаць аб тым, што дырэктывы наконт узмацненьня тэмпаў загатовак не ажыцьцяўляюцца.

У сваёй пастанове ад 23 лістапада Савет Народных Камісараў адзначыў, што за апошнія пяцідзёўкі наглядаецца рэзкае зьніжэньне тэмпаў загатовак, што загатоўчыя органы яўна аслабілі ўвагу да кампаніі.

Гэта ацэнка застаецца і зараз зусім правільнай.

Калі мы параўнаем даныя аб загатоўках за 4 і 5 пяцідзёўкі лістапада, дык убачым наступны малюнак: за час з 15 да 20 лістапада загатоўлена 7,5 проц. месячнага пляну, за час з 20 па 25 лістапада—толькі 7 проц.

З пачатку месяца загатоўлена толькі 39,8 проц. лістападаўскага пляну.

За ўвесь час загатовак выканана 66,2 проц. гадавога пляну.

Трэба адзначыць, што ў той час, як Белільнасаюз за лістапад выканаў 93 проц. пляну, Белкаапсаюз загатовіў толькі 34,5 проц. Як мы бачым, апарат спажывецкай кааперацыі ня здолеў справіцца з даручаным яму адказным заданьнем.

Апошняя зводка сыгналізуе аб аслабленьні ўвагі да загатовак з боку райкалгассаюзаў і праўленьняў калгасаў. Ня гледзячы на шматлікія дырэктывы, калгасы выканалі толькі 50% гадавога пляну загатовак. За месяц імі загатоўлена 62,5 проц. заданьня.

Крывая загатовак за апошнюю пяцідзёўку зьнізілася на 0,2 проц.

Зусім недапушчальна адставаньне саўгасаў—дзяржаўных фабрык збожжа. Яны цягнуцца ў хвосьце здатчыкаў.

25,4 проц. гадавога пляну—ганебная лічба, якая патрабуе прыняцьця самых рашучых мер у адносінах да кіраўнікоў нашых саўгасаў.

Думка—«саўгаснае збожжа ад нас не ўцячэ»—зьяўляецца шкодная, сапраўды апартуністычная. Па настроях самацёку трэба бязьлітасна ўдарыць.

Адзінасобныя гаспадаркі даюць за апошнюю пяцідзёўку таксама зьніжэньне тэмпаў—з 7,9 проц. да 7,1%.

Гадавы плян загатовак выканан індывідуальным сэктарам на 81,4 проц.

І, нарэшце, зусім дрэнна наступае збожжа па кантрактацыйных дагаворах—38,9 проц. гадавога пляну.

Такія вынікі апошняй дэкады сьведчаць аб пагрозе сваячасоваму выкананьню гадавога пляну.

Даюць аб сабе ведаць апартуністычныя адносіны да збожжазагатовак—важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі дня. У радзе месц ішчэ не ўсьвядомілі таго факту, што сваячасовае сканчэньне загатовак набывае выключнае значэньне ў адносінах ажыцьцяўленьня ўдарных тэмпаў сацыялістычнага наступленьня, у справе выкананьня прамфінпляну.

Весткі аб выкрыцьці шкодніцкай арганізацыі, аб судзе над «прампартыяй», аб пагрозе інтэрвэнцыі выклікалі вялікую хвалю абурэньня і гневу шырокіх мас бядняцка-сераднякцкага сялянства.

У адказ інтэрвэнтам арганізуюцца чырвоныя абозы, датэрмінова выконваюцца пляны загатовак, прымаюцца сустрэчныя пляны.

6 раёнаў БССР: Ветрынскі, Вушацкі, Астрашыцка-Гарадзецкі, Жыткавіцкі, Полацкі, Халопеніцкі значна перавыкалі гадавое заданьне.

Калгасьнікі—беднякі і сераднякі дэманструюць сваю салідарнасьць з рабочай клясай і камуністычнай партыяй.

Мясцовыя арганізацыі павінны ўмацаваць гэты ўздым, падхапіць ініцыятыву перадавых сераднякоў і беднякоў, мабілізаваць усе сілы на выкананьне да 10 сьнежня гадавога пляну загатовак.

У радзе месц кулацтва ўпарта сабатуе здачу збожжа. Трэба рашуча націснуць на кулака!

Апартуністыя дзе-ні-дзе балбочуць аб немагчымасьці выкананьня пляну. Ударнай работай па загатоўках прыдушым ныцьцё малаверaў.

100 проц. пляну—да 10-га сьнежня!

Агідныя скрыўленьні клясавай лініі у загатоўках

БОРКАВІЧЫ. (Наш кар.). Партыя і ўрад далі зусім выразную дырэктыву—даводзіць пляны загатовак да вёскі і да кулацка-заможнага двара. Пляны здачы прадуктаў бядняцка-сераднякцкімі гаспадаркамі павінны прымацца на агульных сходах, прычым беднякі і сераднякі здаюць збожжа, бульбу і інш. у парадку самаабавязацельства — ні ў якім разе недапушчальна давядзеньне цьвёрдых заданьняў да бядняцка-сераднякцкіх двароў.

Пры разьмеркаваньні-ж пляну загатовак бульбы на Замчанскім і Луначарскім сельсаветах дапушчаны грубыя скрыўленьні клясавай лініі, парушэньні дырэктыў партыі.

Замшанская ячэйка, не правёўшы папярэдніх сходаў беднаты па пытаньні бульбазагатовак, не мабілізаваўшы грамадзкасьці вакол гэтай баявой работы, стала праводзіць агульныя сходы па вёсках. Амаль усюды з-за некадрыхтаванасьці сходаў пляны ня былі прыняты. Тады, убачыўшы, што пляны загатовак сарваны, сакратар парт'ячэйкі т. Гольман, сакратар сельсавету т. Бяляеў і прадстаўнік РВК т. Шпакоўскі давялі цьвёрдыя заданьні да 99 гаспадарак; у гэтым ліку — да 71 бядняцка-сераднякцкай гаспадаркі, з якіх 14 зусім вызвалены ад с.-г. падатку.

Такія-ж скрыўленьні дапушчаны і ў Луначарскім сельсавеце, дзе цьвёрдыя заданьні даведзены да 65 гаспадарак, з якіх 5 вызвалены ад падатку, 11 плацяць да 10 руб. і г. д.

Тут мы маем арыгінальнае злучэньне сапраўднага «левага» загібу з правапартуністычнай практыкай.

Атрымаўшы весткі аб гэтым, райком паслаў у Замчанскі сельсавет спэцыяльную камісію для праверкі і выпраўленьня дапушчаных памылак. Камісія праз прэзыдыум сельсавету скасавала цьвёрдыя заданьні бядняцка-сераднякцкім гаспадаркам, правяла сходы па вёсках, растлумачыла бедняком і сераднякам сутнасьць грубых памылак, дапушчаных мясцовымі работнікамі і паставіла пытаньне на партсходзе, які асудзіў учынкі сакратара парт'ячэйкі і паасобных камуністых.

У Луначарскім сельсавеце цьвёрдыя заданьні пакінуты толькі для 23-х кулацка-заможных гаспадарак.

Бюро Боркавіцкага раённага камітэту партыі, абмеркаваўшы пытаньне аб скрыўленьні лініі ў Замчанскім і Луначарскім сельсаветах, у сваёй пастанове адзначыла, што гэтыя скрыўленьні зьявіліся вынікамі апартуністычнай практыкі — недаацэнкі работы з беднатой, нявер'я ў серадняка, у магчымасьць прыцягненьня апошняга да ўдзелу ў бульбазагатоўках на зусім добраахвотных начатках.

За грубае скрыўленьне лініі партыі ў бульбазагатоўках абвешчана вымова сакратару Замчанскай ячэйкі тав. Гольману, апошні зьнят з работы сакратара ячэйкі.

Зьнят з работы і атрымаў вымову старшыня Замчанскага сельсавету тав. Бяляеў. Упаўнаважанаму РК па бульбазагатоўках тав. Шпакоўскаму абвешчана вымова.

Дана вымова за скрыўленьне лініі і сакратару Луначарскай ячэйкі тав. Каржову

В.

Нельга адставаць, падцягнецеся

Наступныя раёны адстаюць у выкананьні плянаў збожжазагатовак.

Самахвалавіцкі раён выканаў толькі 35 проц. заданьня, Чачэвіцкі — 33,6 проц., Глускі — 45,5 проц., Клімавіцкі—46,7 проц., Стара-Дароскі —42,2 проц., Клічаўскі — 47,2 проц., Сьвіслацкі — 47,8 проц., Чэрыкаўскі — 49,4 проц., Парыцкі — 49,4 проц., Любаньскі — 50,3 і Чырвона-Слабодзкі — 56,1 проц.

Бульбу—пралетарскім цэнтрам

Усе тэрміны прайшлі

Заўтра чакаем данясеньняў з раёнаў партыі і ўраду:

181.000 тон бульбы пралетарскім цэнтрам адгружана

Заўтра апошні дзень адгрузкі бульбы. Заўтра ўсе раёны павінны скончыць вываз бульбы пралетарскім цэнтрам.

Да 28 лістапада адгружана 171.076 тон бульбы, што складае 94,5 проц. заданьня.

Калі-б адгрузка была разгорнута як належыць, калі-б раёны захавалі ранейшыя тэмпы вывазу, заданьне можна было-б выканаць яшчэ тыдзень назад. Але за апошні час мы наглядаем ганебнае адставаньне адгрузкі. За 28 лістапада адгружана толькі 500 тон—менш 10 проц. адгрузкі бульбы за 18-19-XI.

Як і раней, адстае Белкаапсаюз, які выканаў заданьне на 82,5 проц.

Спажывецкая кааперацыя не прыняла рашучых мер, каб узмацніць тэмпы адгрузкі.

Чацьвёрка, у сваёй пастанове ад 25 лістапада, абавязвае ўсіх загатоўшыкаў і раённыя арганізацыі скончыць адгрузку пралетарскім цэнтрам не пазней 1-га сьнежня. Раёны, якія выканалі плян, ні ў якім разе не павінны аслабляць вываз.

Застаецца вывезьці 10.000 тон.

Мізэрная колькасьць параўнальна выкананым планам.

Таму раёны і загатоўшчыкі павінны бяз усякіх адгаворак, карыстаючыся спрыяючым надвор'ем, за 29-30 лістапада адгрузіць гэтыя 10.000 тон, каб 1-га сьнежня можна было са здавальненьнем заявіць, што БССР ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЛА СВОЙ АБАВЯЗАНЬНЕ ПЕРАД РАБОЧАЙ КЛЯСАЙ СССР.

Зьняць з работы за зрыў заданьня

За зрыў заданьня партыі і ўраду па адгрузцы гароднінны пралетарскім цэнтрам урадавая чацьвёрка пастанавіла зьняць з работы старшыню Мазырскага райкаапсаюзу. Справа перадана пракурору для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

Усім РК і РВК

За апошнія дні вываз бульбы ў цэнтры СССР недапушчальна зьнізіўся. Усе тэрміны пранушчаны. Прапануем падсілкаваць РК і РВК да 1-га сьнежня поўнасьцю скончыць вывазку. Раёны, якія маюць нарады Паўночна-заходняга саюзу, Галоўаэнпорту ЛВО аслабяваюцца ад адгрузкі ў Маскву і Ленінград. Іншыя раёны, як і раней, грузяць Маскве і Ленінграду.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГЕЙ.
Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.

Загатаўляць лён—

ГЭТА НЯ ЗНАЧЫЦЬ ЧАКАЦЬ ЯГО НА ПРЫЁМАЧНЫХ ПУНКТАХ

Ніводнага дня адтэрміноўкі кулаку ў выкананьні цьвёрдых заданьняў

Апошняя пяцідзёўка лістапада не дала ніякага пералому ў ільна-загатоўках. На 25 лістапада гадавы плян па загатоўцы ільну-валакна выканан па БССР толькі на 2,1 , па каноплях—на 1,2 проц.

Асабліва кепска разгортвае загатоўкі валакна сыстэма спажывецкай кааперацыі. Такое-ж амаль становішча па сыстэме Белпаляводсаюзу.

Дагэтуль вакол пытаньняў загатоўкі валакна не мабілізавана грамадзкасьць. Калгасьнікі і бядняцка-сераднякцкія масы ня ўцягнуты ў работу па садзейнасьці загатоўкам.

Урадавая чацьвёрка пастанавіла:

У мэтах больш пасьпяховага выкананьня ільназагатовак прызнаць патрэбным РАСКЛАСЬЦІ ДАДАТКОВЫ ПЛЯН У РАЗЬМЕРЫ 2.600 тон з такім разьлікам, каб за кошт гэтых дадатковых 2.600 тон дагрузіць тыя раёны, якія аказаліся менш нагружанымі, і адначасова не павялічваць найбольш нагружаныя раёны.

Дадатковы плян ільназагатовак, вызначаны Наркамгандлем Саюзу (замест 18.000 тон — 20.000), давесьці да раёнаў не пазьней сёньняшняга дня.

Наркамгандлю пры канчатковай раскладцы дадатковых нарадаў на ільназагатоўкі ўлічыць патрэбнасьць дачы заданьняў і тым раёнам, якія ня пічацца спэцыялізаванымі ільнаводнымі раёнамі, але ў якіх фактычна сеецца лён і каноплі.

Абавязаць Дзяржплян на наступным пасяджэньні СНК прадставіць свае канчатковыя меркаваньні аб разьмерах пасеўнай плошчы ільну, аб канчатковым пляне ільназагатовак і забесьпячэньні насенным матар'ялам для выкананьня пляну пасеваў ільну ў 1931 г.

Абавязаць Ільнасаюз, Белкаапсаюз і НКЗ ужыць тэрмінова захады да таго, каб пры правядзеньні загатовак ільнянога семя забраніроўваліся патрэбныя фонды пасеўных матар'ялаў.

Абавязаць загатоўчыя сыстэмы падасабістую адказнасьць старшынь забясьпечыць сваячасовае прадстаўленьне пяцідзённых вестак аб ходзе загатовак ільну, канапель і семя.

Абавязаць загатоўчыя арганізацыі ўстанавіць бесьперапынную работу прыёмачных пунктаў з тым, каб здатчык мог завезьці на здатачныя пункты ільнянное семя ва ўсякі дзень.

Прапанаваць Белкаапсаюзу дапажыць на наступным пасяджэньні чацьвёркі аб канкрэтных мерапрыемствах у сэнсе забесьпячэньня таварных фондаў для прэміраваньня здатчыкаў.

Наркамгандлю па сваёй лініі вызначыць некаторую суму грошай для прэміраваньня часткі раёнаў, якія з найбольшым посьпехам выканалі плян загатовак ільну.

15 вагонаў лыка ў ільнаводныя раёны

ПАВОДЛЕ РАСПАРАДЖЭНЬНЯ НАРКАМГАНДЛЮ, У ІЛЬНАВОДНЫЯ РАЁНЫ БССР НАКІРОЎВАЕЦЦА 15 ВАГОНАЎ ЛЫКА. БЕЛКААПСАЮЗ ВЫЛУЧЫЎ РАБОТНІКАЎ ДЛЯ ПРАСОЎВАНЬНЯ ГЭТАГА ЛЫКА НА МЕСЦЫ.

Мабілізацыя сродкаў насельніцтва

ЗАЎТРА пачынаецца ўдарная ДЭКАДА

ДАБ'ЕМСЯ ЗА ДЗЕСЯЦІДНЕЎКУ ВЫКАНАНЬНЯ БАЯВОГА ЗАДАНЬНЯ:

МАБІЛІЗАВАЦЬ 56.000.000 руб. у фонд сацыялістычнага будаўніцтва

Рашаючая дэкада

Высокія тэмпы гаспадарча-культурнага будаўніцтва патрабуюць значных грашовых укладаньняў. Таму пытаньне выкананьня і перавыкананьня фінансавых пляну ў высоўваецца, як першачарговае баявое заданьне, ажыцьцяўленьне якога павінна забясьпечыць фінансавую базу сацыялістычнага наступленьня.

Між тым, даныя аб ходзе выкананьня фінансавых пляну гавораць аб недапушчальна нізкіх тэмпах збору абавязковых і добраахвотных плацяжоў насельніцтва.

У чым прычыны прарываў на фронце мабілізацыі сродкаў? Падрабязны аналіз матар'ялаў прыводзіць да вываду, што прарывы тлумачацца амаль выключна НЯДБАЙНЫМІ АПАРТУНІСТЫЧНЫМІ АДНОСІНАМІ З БОКУ МНОГІХ РАЁННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ.

Часта на мясцох ня ўмеюць палітычна і гаспадарча аб'яднаць некалькі баявых кампаній, якія праводзяцца зараз на вёсцы. За апошнія дні ў радзе раёнаў наглядаліся выпадкі, калі ўвесь фінансавы апарат мабілізаваўся на ўборку бульбы, а справа мабілізацыі сродкаў зусім забывалася.

Для таго, каб пацьвердзіць думку аб прычынах прарываў, досыць прывесьці прыклад з рэалізацыяй пазык. Ідэя рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады», высунутая самімі рабочымі, была горача падтрымана шырокімі працоўнымі масамі БССР. Між тым, з-за злачыннай бязьдзейнасьці раду арганізацый, дагэтуль яшчэ не аформлена падпіскі на некалькі мільёнаў рублёў, утрыманыя ўзносы марынуюцца ў касах устаноў і г. д.

Другая прычына фінансавых прарываў — гэта СЛАБАЯ ФІНАНСАВАЯ ДЫСЦЫПЛІНА І НЕСКАРЫСТАНЬНЕ ЎНУТРАНЫХ РЭСУРСАЎ МНОГІМІ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ І ЎСТАНОВАМІ. Праведзеная органамі КК-РСІ і НКФ масавая праверка выявіла сотні тысяч рублёў запазычанасьці па кватэрнай плаце ў жамках, вельмі значнае затаварваньне ў радзе кааперацыйных арганізацый.

Ударная дэкада павінна палажыць канец злачынна нядбайным адносінам да кампаніі мабілізацыі сродкаў.

Дабіцца ліквідацыі фінансавых прарываў, уцягненьня ўкамплектаванасьці працоўных, узмацненьня фінансамас працоўных, узмацненьня фінансавай дысцыпліны і адказнасьці прадпрыемстваў — задача ўдарнай дэкады мабілізацыі сродкаў.

Л. ГРАДЗЯНСКІ.

МОВА ЛІЧБАЎ І ФАКТАЎ

(АГЛЯД КАРЭСПАНДЭНЦЫЙ З МЕСЦ)

Заданьне сабраць 56 млн. руб. на працягу ўдарнага кварталу патрабуе мабілізацыі ўсіх сіл партыйных, савецкіх і прафэсыянальных арганізацый.

Мабілізацыя сродкаў насельніцтва зьяўляецца баявой задачай, на выкананьне якой павінны быць кінуты ўсе сілы. На жаль, гэта ня ўявілі сябе многія раённыя і вясковыя арганізацыі.

Дагэтуль фінансавы плян ударнага кварталу ажыцьцяўляецца вельмі павольна, не адчуваецца ўдарнасьці ў рабоце, кампанія не пераведзена на рэйкі сацыялістычнага спаборніцтва.

Весткі з месц, лісты брыгадзіраў, рабськораў даюць яскравы малюнак ходу мабілізацыі сродкаў па раёнах.

Вось, напрыклад, што піша нам брыгадзір т. Матусэвіч М. Г.

У Крычаўскім раёне на 20-га лістапада плян мабілізацыі сродкаў выкананы толькі на 40,7 проц.

Раймалжывсаюз, які павінен быў сабраць 35.000 руб., не сабраў ні аднаго рубля паёў і ўкладаў. Раённая спажывецкая кааперацыя ўсё надзеі паклала на самацёк, не праводзіла ніякай работы і дабілася выкананьня пляну пазыкакапленьня на 16 проц.

Райкалгассаюз выканаў квартальнае заданьне на... 0,7 проц.

Райшчадкаса не займаецца вярбоўкай укладчыкаў і не арганізавала прыпісных кас на такіх прадпрыемствах, як фасфарытны завод і пабудова цэмэнтнага заводу.

Тав. Матусэвіч зусім правільна падкрэсьлівае, што ўдарная задача бліжэйшых дзён — барацьба з курсам на самацёк, з апартунізмам у рабоце па мабілізацыі сродкаў.

Брыгадзір т. Сяліцкі ў сваёй карэспандэнцыі падрабязна спыняецца на ходзе мабілізацыі сродкаў па Брагінскім раёне.

Запазычанасьць па добраахвотных і абавязковых плацяжох дасягае на раёне каля ½ млн. руб.

Райкалгассаюз на сваіх складах накапіў тавараў — с.-г. машын і інш. на суму звыш 100.000 руб.

РВК ня мае зусім вестак аб зборы самаабкладваньня па раёне. У ашчаднай справе панує самацёк.

Ёсьць выпадкі затрымліваньня ўстановамі ўзносаў на пазыцы. Напрыклад, райкаапсаюз затрымліваў поўгі час 350 руб. узносаў.

Раённыя арганізацыі не завастралі ўвагі грамадзкасьці на кампаніі мабілізацыі сродкаў за кастрычнік выкананы толькі на 67,6 проц., у лістападзе наглядаецца зьніжэньне тэмпаў паступленьня плацяжоў. Райспажывецкае таварыства, атрымаўшы заданьне на ўдарны квартал, зьменшыла кантрольныя лічбы ў кастрычніку і павялічыла іх у сьнежні, зацягваючы, такім чынам, выкананьне заданьня.

Ашчадкаса займаецца толькі... рамонтам памяшканьня. Месячнае заданьне па ўцягненьні фізычных укладаў выканана на 56 проц. у той час, калі сам загадчык райашчадкасы прызнае, што заданьне для Коханаўскага раёну паменшана. Райкалгассаюз і райкаапсаюз зусім нічога ня робяць для збору паёў.

Тав. Янс паведамляе, што ў Бабруйскім раёне падпіска на пазыку ў сельсаветах ідзе нездавальняюча. Заданьне ахапіць кожную гаспадарку пазыкай на 6 руб. ня выканана: замест 6 руб. у сярэднім рэалізавана 65-70 кап. Нельга гаварыць, аб «аб'ектыўных прычынах». Сродкі на вёсцы ёсьць. Паводле няпоўных вестак, па раёне і горадзе выплачана незямляробчых заработкаў каля 4 млн. руб., а атрымана ад насельніцтва праз абавязковыя і добраахвотныя плацяжы толькі 480.000 руб. Справа ў апартуністычнай бязьдзейнасьці мясцовых арганізацый і ў недаацэнцы значэньня кампаніі мабілізацыі сродкаў.

Тав. Машніцкі Ў. у сваёй карэспандэнцыі падкрэсьлівае, што галоўная прычына дрэннага выкананьня пляну збору сродкаў па Жлобінскім раёне — гэта нядбайныя адносіны да збору плацяжоў. Яскравы прыклад—прападўнік, РВК гаворыць, што ў раёне «няма кулака», што «знайсьці яго амаль нельга». Гэтыя словы досыць характарызуюць адносіны мясцовых работнікаў да кампаніі. Няма чаму зьдзіўляцца, што на вёсцы пазыка «Пяцігодка — за чатыры гады» рэалізавана толькі на 52 проц., што раённая ашчадная каса выканала заданьне на вярбоўцы ўкладчыкаў толькі на 10 проц., што райкалгассаюз пры заданьні ў 8.600 руб. не сабраў ні аднаго рубля, што райкаапсаюз мабілізаваў 724 руб. пры кантрольнай лічбе ў 28.400 руб.

Раённая ашчадная каса дагэтуль не атрымала памяшканьня і працуе ў халодным пакоі.

Тав. Д—н паведамляе з Копыскага раёну, што ў Маслоўскім сельсавеце некалькі кулакоў зусім не заплацілі ні аднае капейкі падатку, пад суд не ўзданы, маемасьць іх не канфіскавана.

Копыскі местачковы савет налічыў самаабкладваньне на бядняцкія гаспадаркі, вызваленыя ад с.-г. падатку. Гэты-ж савет зусім забыўся прыцягнуць да самаабкладваньня местачковых гандляроў і саматужнікаў. Тав. Д—н характарызуе такую работу, як злучэньне правапартуністычнай практыкі з «левымі» загібамі.

Тав. Бірштэйн піша з Заслаўскага раёну аб добрай ініцыятыве мясцовых кааперацыйных і кредытных устаноў. У адказ на атрыманае заданьне па мабілізацыі сродкаў, яны высунулі свой сустрэчны плян, які на 100 проц. павялічвае канторльныя лічбы па ўсіх відах плацяжоў.

Напрыклад, крэдытнае таварыства павінна за ўдарны квартал атрымаць пазычак на 48.000 руб., падвых узносаў — на 2.000 руб., мэтавых укладаў — на 15.000 руб. Т-ва высунула свой плян, які ў два разы павялічвае гэта заданьне.

Тое-ж самае зрабіла і спажывецкае таварыства.

Пляны абмяркоўваліся на сходах работнікаў кааперацыйных арганізацый, якія абвясьцілі сябе ўдарнікамі і далі абяцаньне не пакідаць работы на працягу пяцігодкі.

Выкананьне сустрэчнага пляну будзе праводзіцца на аснове шырокага сацыялістычнага спаборніцтва кааперацыйных работнікаў.

Прыкладу Заслаўя павінны пасьледаваць усе іншы арганізацыі.

Ударная дэкада мабілізацыі сродкаў павінна даць пералом у галіне выкананьня фінансавага пляну.

Коханава наперадзе

Коханаўскае спажывецкае таварыства выканала 92 проц. квартальнага фінпляну

За апошнія дзьве дэкады з 1-га па 20-га лістапада заўважваецца некаторы пералом у пазнакапленьні на вёсцы. За гэты час вясковая спажывецкая кааперацыя сабрала паёў 937.000 руб. супроць 855.000 за ўвесь кастрычнік.

Лістападаўскі плян выканан на 54,8 проц. Але гэтыя тэмпы ўсё-ж не забясьпечваюць поўнага выкананьня пляну асобнага кварталу таму, што лістапад павінен пакрыць і недабор за кастрычнік.

З пачатку асобнага кварталу плян пазнакапленьня па вёсцы выкананы ўсяго толькі на 31,3 проц.

НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ ІДЗЕ КОХАНАЎСКАЕ СПАЖЫВЕЦКАЕ ТАВАРЫСТВА — 92 ПРОЦ. КВАРТАЛЬНАГА ПЛЯНУ, НА ДРУГІМ — МЕНСКАЕ ПРЫГАРАДНАЕ Т-ВА — 74 ПРОЦ., ЛЁЗЬНЕНСКАЕ — 73 ПРОЦ.

ЦЯГНУЦЦА Ў ХВАСЬЦЕ КЛІЧАЎСКАЕ ТАВАРЫСТВА—4,5 ПРОЦ. квартальнага пляну, БЯРЭЗІНСКАЕ — 11 проц., ЛЕЛЬЧЫЦКАЕ — 13 проц., КАРМЯНСКАЕ—15 проц., АСІПАВІЦКАЕ—13 проц.

Па гарадох плян асобнага кварталу выканан на 59 проц. Найлепшыя вынікі даў ВІЦЕБСКІ ЦРК — 95 проц. квартальнага пляну. Адстае ДОБРУСКІ ЦРК — 15 проц.

Усім прадпрыемствам, установам і арганізацыям гор. Менску.

Ня гледзячы на пастанову прэзыдыуму гарадзкога савету аб прадстаўленьні к 25 лістапада сьпісаў выбаршчыкаў,

(«Савецкая Беларусь» ад 15 ліст

МАЛОЧНЫЯ ПРАДУКТЫ пралетарскім цэнтрам—

Невыкананьне пляну кантрактацыі б'е па рабочым забесьпячэньні

Ударыць па галавацяпах з гомельскага ЦРК

Пад кантроль рабочых мас

Прынятыя партыяй і ўрадам мерапрыемствы па арганізацыі малочных ферм пры Белсельтрэсьце і ЦРК, а таксама арганізацыя спэцыялізаваных калгасаў з малочным ухілам — навінны забесьпечыць вырашэньне праблемы малочных прадуктаў у бліжэйшы перыяд. Гэта дае нам магчымасьць ужо на 1931 год устанавіць плян загатовак малочных прадуктаў па 300 проц. больш, чым у мінулым годзе, прычым прадуктыдзяцца атрымаць 50 проц. таварнай малочнай прадукцыі з абагуленага сэктару: саўгасаў, калгасаў і фэрм ЦРК. Каля 25 проц. даюць адны толькі саўгасы і фэрмы ЦРК.

Плян гэты цалкам рэальны і выкананьне яго залежыць выключна ад работы арганізацыі, на якія ўскладзена справа забесьпячэньня працоўных малочнымі прадуктамі. На сёньняшні дзень гэта работа праводзіцца надзвычай дрэнна. У загатоўкі ня ўцягнута ніводная частка малака бядняцка-серадняцкіх гаспадарак вёскі. Зусім не забясьпечана здача таварнага малака кулацка - заможнымі гаспадаркамі. Нават не забясьпечана поўная здача малака калгасамі і саўгасамі. Гэта сьведчыць ад тым, што мае месца недаацэнка значэньня малочных прадуктаў, якое яны маюць у рабочым забесьпячэньні, асабліва для дзіцячага харчаваньня. Таварнае малако ў нашых калгасах, нават саўгасах і фэрмах ЦРК у значнай меры разбазаравацца і не попадае поўнасьцю нашаму рабочаму спажыўцу.

Менскі ЦРК мае фэрму ў складзе 700 дойных кароў са штодзённым удоем у 3.000 літраў малака, на забесьпячэньне-ж гораду здае толькі 1.500 літраў, другая палова выдаецца на месцы. На гэтай фэрме зусім без чаргі і талёну можна атрымаць 1-2 літры малака. Гэта ў той час, калі дзеці гораду не атрымліваюць нават і ўстаноўленай нормы.

Саўгас Белсельтрэсту Завалочыца мае 400 кароў, з якіх 220 дойных з удоем 1.800 літраў малака, а перадае ЦРК толькі 200 літраў, 1.600 літраў разыходзіцца на месцы. Гэты-ж саўгас вельмі нічодра прадае галоўкі сыру і сьметанковага масла, амаль што ўсім праежджым праз саўгас. Цэлы рад саўгасаў вакол Менску расходуе ўсё малако на месцы.

Ці-ж гэта не злачынства супроць забесьпячэньня рабочых і дзяцей?

Зусім слабая ўвага аддаецца справе кантрактацыі малакэ ў калгасах і бядняцка - серадняцкіх гаспадарках і выкананьню гэтых дагавораў. Адгэтуль і вынікі таго, што ў мінулым годзе наша малочная канцэрацыя праваліла кантрактацыю малака. Малочная канцэрацыя нават ня мае ўліку тых прадуктаў, якія былі адпушчаны ёй на пакаванную мэту. Адгэтуль і тая слабасьць работы на кантрактацыі, якая праводзіцца ў цяперашні час, што пагражае выкананьню вызначанага пляну.

Справа забесьпячэньня гарадоў малочнымі прадуктамі, а дзяцей малаком, патрабуе неадкладнага перагляду нашай работы ў загатоўках масла. Трэба дабіцца зразуменьня з боку ўсіх кіраўнікоў нашых саўгасаў і фэрм і іх грамадзкіх арганізацый, таксама работнікаў малочнай канцэрацыі, што выкананьне пляну [illegible] разбазараньне малака на месцах [illegible] цяжкім злачынствам, што перашкаджае рабочаму забесьпячэньню.

Трэба неадкладна арганізаваць рабочы кантроль ня толькі над расходваньнем малака, але, галоўным чынам, за працай тых арганізацый, якія абавязаны дастаўляць малако для рабочага забесьпячэньня.

Трэба з усёй жорсткасьцю палажыць канец тым абураючым зьявішчам, якія ёсьць на гэтым участку. Гэтага патрабуе справа рабочага забесьпячэньня.

АБРАМСОН.

Толькі 4,6 проц.

З 1-га кастрычніка па 15 лістапада праводзілася кампанія па кантрактацыі малочных прадуктаў на 1931 год. З прычыны нядбайных адносін да гэтай кампаніі з боку загатоўшчыкаў, асабліва райкаапсаюзаў, якія зьяўляюцца асноўнымі загатоўшчыкамі малочных прадуктаў, плян выканан толькі на 4,6 проц.

69 раёнаў зусім не прыступілі да кантрактацыі. На неаднаразовыя запатрабаваньні даць весткі аб ходзе кантрактацыі, большасьць раёнаў адказала: «Работа не распачата», «работу толькі пачынаем», «да кантрактацыі прыступілі». Ня гледзячы на тое, што тэрмін кантрактацыі ўжо даўно мінуў, пляны засталіся нявыкананымі.

Аршанскі райкаапсаюз нават адмовіўся прыняць камандыраваных яму людзей для правядзеньня кантрактацыі. Менск, які паводле пляну павінен атрымліваць у суткі 7 тон малака, атрымлівае ўсяго 1,5 тоны; Гомель — замест 3,5 тоны атрымлівае 0,2 тоны. Ня лепш справа стаіць і ў іншых прамысловых гарадох. Такое становішча з забесьпячэньнем малака прывяло да скарачэньня выдачы малака дзіцячым дамом і больніцам.

З агульнай сумы малака — 115.000 тон 40.000 тон павінен даць сацыялістычны сэктар.

Аднак, значная частка калгасаў лішкі малака з абагуленай жывёлы скарыстоўвае на месцы. Таварнасьць малака значна паменшылася. На існуючых малочных фэрмах, з прычыны дрэннага догляду жывёлы, таварнасьць малака панізілася да 50 проц., а месцамі — да 30 проц.

Зараз кампанія па кантрактацыі малочных прадуктаў працягнута да 15-га сьнежня. За гэты час трэба нагнаць прапушчанае і выканаць вызначаны [illegible] прадуктаў на 1931 год павінна быць выканана.

Борніцтва паміж раёнамі, сельсаветамі і калгасамі. Лічба 115 тон малочных

А. УСАЎ.

Поўная безгаспадарчасьць

На старонках «Зьвязды» ўжо ня раз пісалася пра агіднае становішча ў прыгараднай гаспадарцы Гомельскага ЦРК. Праўленьне ЦРК не зрабіла для сябе адпаведных вываадаў з недахопаў, якія былі пры арганізацыі жывёлагадоўчага пункту.

Праўленьне ЦРК прыступіла да стварэньня малочнай фэрмы, ня маючы будынкаў і адпаведных умоў для ўтрыманьня жывёлы. Плян укамплектаваньня жывёлай выкананы на 135 проц., а плян будаўніцтва выкананы на 10 проц. У хлявох, дзе яшчэ ня скончана будаўніцтва, у антысанітарных умовах утрымліваецца 1.000 кароў. Значная частка жывёлы знаходзіцца пад адкрытым небам. Фэрма адчувала недахват у саломе, каровы стаялі па калені ў гразі, работнікі ЦРК кідаліся ў розныя бакі ў пошуках салому, а ў гэты час на ст. Гомель стаяла 28 вагонаў саломы, прызначанай для Гомельскага ЦРК. На працягу 10 дзён ніхто не выкупляў саломы і чыгуначная адміністрацыя была прымушана прадаць салому з таргу. На сёньняшні дзень на гарэлым балоце знаходзіцца каля 18 вагонаў саломы, якая ўжо пачала гніць, а праўленьне ЦРК ня ўжывае ніякіх мер да перавозкі саломы на фэрму. З прычыны дрэннага нагляду за жывёлай, таварнасьць знач на панізілася. Удой малака складае 33 проц. За апошні час наглядаюцца захворваньні жывёлы.

Пракуратура павінна палажыць канец такому становішчу на фэрме.

Брыгада «Зьвязды»: Рубежын. Каганскі. Леўчын.

Пастанова ЭКАНА БССР ня выконваецца

У прыгарадных гаспадарках ЦРК Беларусі на сёньняшні дзень налічваецца каля 5.000 штук буйной малочнай жывёлы. Значная частка малака выкарыстоўваецца на месцы. Частка гэтага малака ідзе на кармленьне маладняка. Сярэдні прырост маладняка па ўсіх гаспадарках складае каля 4.000 цялят у год. Калі ўлічыць, што пры нармальным кармленьні цяляці патрэбна ў сярэднім 6 літраў малака ў дзень, пры чым, да 2-х месячнага ўзросту цялят кормяць выключна чыстым малаком, дык атрымаецца, што кожны год каля мільёна літраў малака ўходзіць на кармленьне маладняка.

ЭКАНА БССР у сваёй пастанове ад 21 красавіка абавязала Наркамзем забясьпечыць прыём маладняка ад прыгарадных гаспадарак на гадоўлю яго ў больш аддаленых гаспадарках, што дало-б магчымасьць скарыстаць малако, якое ідзе на кармленьне маладняка ў прыгарадных гаспадарках для забесьпячэньня гораду.

На вялікі жаль, гэта пастанова пакуль што не ажыцьцяўляецца. Адпаведным арганізацыям трэба зацікавіцца гэтым пытаньнем.

Ф.

Да 10-годзьдзя ССР Арменіі

Тэлеграма ЦВК БССР

Эрывань, ЦВК Арменіі

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР шле палкае прывітаньне рабочым, калгасьнікам, бядняцка-серадняцкаму сялянству і ўсім працоўным Арменіі, вызваленым Кастрычніцкай рэвалюцыяй ад сацыяльнага і нацыянальнага ўціску, сьвяткуючай 10-годзьдзе існаваньня Савецкай Арменіі. Вялізарныя дасягненьні Савецкай Арменіі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, у тым ліку і ў ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі, сталі магчымымі толькі на аснове правядзеньня ў жыцьцё генэральнай лініі партыі, пад кіраўніцтвам яе ленінскага ЦК і пры магутным падтрыманьні з боку Саюзу ССР.

Жадаючы працоўным Савецкай Арменіі посьпехаў у далейшых этапах сацыялістычнага будаўніцтва, прэзыдыум ЦВК БССР упэўнен, што ССРА, узмацняючы дыктатуру пралетарыяту, шырока разгортваючы сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, разам з усімі брацкімі сацыялістычнымі савецкімі рэспублікамі дасягне перамогі сацыялізму.

Няхай жыве ССР Арменіі!
Няхай жыве Саюз ССР!
Няхай жыве кіраўнік сацыялістычнага будаўніцтва—камуністычная партыя і яе ленінскі ЦК!

Старшыня ЦВК БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар ЦВК А. ХАЦКЕВІЧ.

На Савецкай Беларусі

Машыністы тав. Іваноў папярэдзіў крушэньне

ВОРША. (Наш кар.). 6 лістапада машыністы Аршанскага дэпо ІВАНОЎ АЛЕСЬ заўважыў, што ў кар'еры 115 кілёмэтра на галоўны шлях ідуць вагоны без паравоза. У той-жа час насустрач вагонам падыходзіў цягнік.

Тав. Іваноў, убачыўшы небясьпеку, паклікаў на дапамогу стрэлачніка і, перасакочваючы з вагона ў вагон, спыніў іх у той час, калі яны прайшлі ўжо 2 стрэлкі і выйшлі на галоўны шлях.

ДЗЯКУЮЧЫ ТАВ. ІВАНОВУ БЫЛО ПАПЯРЭДЖАНА КРУШЭНЬНЕ.

Начальнік станцыі Ворша вынес тав. Іванову ПАДЗЯКУ. Рабочыя патрабуюць ПРЭМІЯВАЦЬ тав. Іванова за яго гэраічны ўчынак.

Спыніць зьнішчэньне цягавай сілы

ПЛЕШЧАНІЦЫ. Загатоўчыя арганізацыі Плешчаніцкага раёну закупляюць у сялянства здаровых, прыгодных для працы коняй і забіваюць іх для скурзагатовак. Нядаўна ў адзін з рыначных дзён было забіта каля 100 коняй.

Інакш як злачынствам гэтага кваліфікаваць нельга. Калгасам патрэбна цягавая сіла, а яна зьнішчаецца скурзагатоўшчыкамі.

Плешчаніцкі РВК павінен арганізаваць належны кантроль за забойствам коняй.

Адпаведныя арганізацыі павінны прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у зьнішчэньні цягавай сілы.

СПАРТАК.

Белсельтрэст корміць абяцанкамі...

СІРОЦІНА. Саўгас Лясковічы не прыступіў яшчэ да малацьбы. Прычына—адсутнасьць пасу да малатарні. Прай шло ўжо больш за месяц, як Белсельтрэст абяцаў прыслаць нас, аднак, далей абяцанак справа ня рушыцца. Тры разы саўгас зварачаўся ў Белсельтрэст з просьбай, каб хутчэй прыслалі нас, але Белсельтрэст на гэтыя адносіны нават не адказаў.

Каля месяца назад у саўгас прыбыла 100 штук жывёлы; для прывязваньня яе патрэбны вярбоўкі, але і тут Белсельтрэст толькі корміць абяцанкамі. Жывёла стаіць нявіпрывязанай.

Мы просім узьдзейнічаць на бюраратаў з Белсельтрэсту, якія зрываюць падрыхтоўку саўгасу да веснавой пасеўнай кампаніі.

ЛЯСКОЎСКІ.

Рабочай моладзі--спартыўны стадыён

БАРЫСАЎ. У Барысаве ёсьць усе магчымасьці для развіцьця зімовага спорту (рака, месца для катка і г. д.). Між тым, раённая арганізацыя фізкультуры не вядзе падрыхтоўкі да зімовага сэзону. 30-тысячная армія рабочай моладзі Барысава ня мае нават зімовага спартыўнага стадыёну.

Барысаўскія лыжнікі жадаюць прыняць удзел у ворша-лыжным пробегу, які арганізуецца ВСФКВ да ўсебеларускага з'езду саветаў. Але кі ўнікі раённага савету фізкультуры не надхапляюць гэтай ініцыятывы.

Культэтатафэтвік.

Арганізацыя вячэрняга рабочага тэхнікуму

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Пры магілеўскім архітэктурна-будаўнічым тэхнікуме арганізуецца вячэрні рабочы тэхнікум. Апошні пачне працаваць з 1 студзеня бягучага году і будзе рыхтаваць тэхнікаў — спэцыялістых сярэдняй кваліфікацыі.

З 15 лістапада арганізуюцца курсы для падрыхтоўкі рабочых да паступленьня ў вячэрні рабочы тэхнікум.

МЕНСК

Арышт контр - рэвалюцыйнай інтэлігенцкай групы нацыянал-дэмакратаў

ДПУ Беларусі арыштавана контр-рэвалюцыйная інтэлігенцкая група нацыянал-дэмакратаў, якая складаецца, у пераважнай большасьці, з былых эсэраў і белагвардзейскіх эмігрантаў, што вярнуліся з-заграніцы.

Савецкі ўрад Беларусі ў свой час даваліў вярнуцца з эміграцыі раду асоб, маючы на ўвазе іх запэўніваньні добрасумленна і аддана працаваць у інтарэсах савецкага будаўніцтва. Сапраўды-ж гэтыя асобы, выкарыстаўшы аказанае ім давер'е, працягвалі сваю контр-рэвалюцыйную дзейнасьць у згодзе з замежнымі буржуазнымі нацыянал-фашысцкімі арганізацыямі і па іх указаньнях.

У ліку арыштаваных—былыя міністры БНР Ластоўскі, Цьвікевіч, Краскоўскі, Смолін, а таксама Лёсік, Некрашэвіч і інш.

Вядзецца следзтва.

Прафработнікі--на мабілізацыю сродкаў

Прэзыдыум ЦПСПБ мабілізаваў трох членаў прэзыдыумаў ЦП саюзаў і 20 работнікаў ЦПСПБ для работы на месцах у якасьці упаўнаважаных на мабілізацыі сродкаў.

Лепшыя ударнікі--на перавыбары сельсаветаў

ЦСПСБ ПАСТАНАВІЎ ПАСЛАЦЬ У КОЖНЫ РАЁН БССР ТРОХ ЛЕПШЫХ РАБОЧЫХ-УДАРНІКАЎ ДЛЯ ДАПАМОГІ МЯСЦОВЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ У ПАДРЫХТОЎЦЫ І ПРАВЯДЗЕНЬНІ СПРАВАЗДАЧНА - ПЕРАВЫБАРЧЫХ КАМПАНІЙ СЕЛЬСАВЕТАЎ.

Новы склад калегіі НКА

СНК БССР зацьвердзіў склад калегіі Наркамасьветы БССР з наступных т. т.: Бялуга, Вожык, Ошэраў, Кандыбовіч, Гурскі, Гольдбрайх, Панаў, Некрашэвіч, Рычкоў, Рубенчык, Клімковіч і Акулін.

Закрыўся зьезд упаўнаважаных МЦРК

Гэтымі днямі скончыўся зьезд упаўнаважаных МЦРК. У спрэчках па дакладу аб становішчы і бліжэйшых задачах МЦРК делегаты зьезду цалкам і поўнасьцю ўхвалілі пастанову і мерапрыемствы партыйных арганізацый у адносінах да кіраўніцтва МЦРК.

Зьезд канстатаваў, што асноўнымі прычынамі прарываў у рабоце МЦРК зьяўлялася адсутнасьць самакрытыкі і перэгаваньне на зьмешчаныя допісы ў друку. Зьезд намеціў рад мерапрыемстваў па паляпшэньні работы МЦРК.

У новае праўленьне МЦРК выбрана 19 чал. Склад праўленьня абноўлен на 85 проц.

***

Старшынёю праўленьня МЦРК выбран т. Кумкес (былы намесьнік старшыні Белкаапсаюзу). Намесьнікам старшыні праўленьня выбран тав. Тарасэвіч.

Аб'яднаньне страхкас

«Цэнтрах», Галоўсацстрах БССР, Белбюро ЦК чыгуначнікаў і НК РСІ БССР распрацавалі праект арганізацыі страхавога абслугоўваньня чыгуначнікаў. Паводле праекту, чыгуначныя страхкасы зьліваюцца з тэрытарыяльнымі страхкасамі БССР.

Аршанская і віцебская вучастковыя страхкасы МББ, гомельская і жлобінская страхкасы Зах. чыгункі ліквідуюцца. Менскі і магілеўскі ўпаўнаважаныя гэтых страхкас будуць падпарадкаваны тэрытарыяльным страхавым органам.

Усе пункты, дзе тэрытарыяльныя страхкасы знаходзяцца далей аднаго кілёмэтра ад лініі чыгункі, будуць або абслугоўвацца работнікамі тэрытарыяльных страхкас шляхам пэрыядычных выездаў, або спэцыяльнымі ўпоўнаважанымі.

Праект абмяркоўваецца сярод шырокіх мас чыгуначнікаў.

Паведамленьні

Кастрычніцкі РК КП(б)Б склікае сёньня 30-XI у 6 гала. веч. у кал. корп. БДУ вузаўскую канфэрэнцыю ўдарнікаў Кастрычніцкага раёну з парадкам дня: 1) Даклад Наркамасьветы аб выкананьні пастаноў лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб рэарганізацыі вышэйшай школы і падрыхтоўцы кадраў; 2) Судаклад БДУ аб рэарганізацыі БДУ ў сувязі з задачамі падрыхтоўкі кадраў; 3) Судаклад рэктара мэдінстытуту аб падрыхтоўцы мэдычных кадраў; 4) Судаклад ВСНГ аб падрыхтоўцы тэхнічных кадраў; 5) Судаклад ЦК пралетстуду аб становішчы ўдарніцтва і сац. спаборніцтва па ВНУ і ВТНУ. Модуо прадстаўніцтва: 1 дэлегат ад 5 ударнікаў. Мандаты належыць атрымаць сакратаром ячэек КП(б)Б у РК з 27 да 30 лістапада.

— Фрунзаўскі РК КП(б)Б паведамляе, што дакладчыкамі па пытаньні аб грашовых труднасьцях вылучаюцца наступныя т. т.: Саевіч—друк. імя Сталіна, Амбражунас—зав. «Д. А.», Канакоцін—«Камунарка», Мінуліч—зав. «Беларусь», Абрамсон—«Кастрычнік», Фрыдман «Чырв. Тэкстыльшчык», Дунец—хлебазавод, Будзінскі—БДБуд, Плятнёў—БДБуд, Папенкоў—БДБуд, Некрашэвіч—«Беларуска», Гурскі—зав. «Пралетары», Марон—рымарная ф-ка, Курцін — скарняжн. ф-ка, Шмідт—Менбуд, Шчацько—аўтакіраўніцтва, Дубавіцкі—прадпр. харчавікоў, Гмілякевіч—«Камунар», Васнабойнікаў—Эльвод, Кроль—ф-ка імя 8 Сакавіка, Яцкевіч—сталов. МЦРК, Галкін—друк. СНК, Ізраіліт—шпалерн. ф-ка. Усе т. т. павінны зьявіцца на кансультацыю, якая адбудзецца 30 лістапада, у 7 гадз. веч., у памяшк. Дому Камасьветы. На кансультацыю павінны таксама зьявіцца ўсе прапагандыстыя ячэек пар. школ.

— Культпроп Кастрычніцкага РК КП(б)Б даводзіць да ведама яч. КП(б)Б, што пры ВСПШ працуе група на нурэйскай мове. Ячэйкі КП(б)Б павінны пырока спавяшчаць на вытворчасьці і правесьці вярбоўку ў нур. групу. Заняткі адбываюцца ў памяшк. 3-й сямігодкі (Міхайлаўская вул., супроць Віленскага рынку).

СЁНЬНЯ:

— ЦК МОПР'у. У 19 гадз.—пашыранае пасяджэньне прэзыдыуму новага складу ЦК МОПР'у БССР. Пасядж. фракцыі прэзыдыуму ЦК там-жа ў 18 гадз. веч.

— Дом Камасьветы. У 18 гадз.—пленум раённага савету ваўўнічых бязбожнікаў Фрунз. раёну.

— Дом Асьветы. У 19 гадз.—агульны сход навуковых працаўнікоў г. Менску, разам з сэкцыяй працасьветы. Даклад т. Будзінскага аб нац. дэмакратызьме.

— ЦСПСБ. У 19 гадз., у габ. старшыні ЦСПСБ т. Рыжова—інструкцыйная нарада рабочых і брыгад, якія накіроўваюцца на вёску для ўдзелу ў перавыбарах сельсаветаў.

— БАН. У 12 гадз.—агульны сход членаў інстытуту гісторыі, дзе адбудзецца даклад т. Кернажыцкага: «Да гісторыі аграрнага руху на Беларусі перад імпэрыялістычнай вайной». Прысутнасьць асьпірантаў-гісторыкаў абавязкова. Уваход вольны.

— Бел. бюро ЦК чыгуначнікаў. У 19 гадз., у клюбе Леніна (пас. ваказ.),—шырокая нарада добраахвотніцкага прафактыву Менскага вузла, сумесна з усімі рабочымі.

— Сход т-ва пэдагогаў-марксыстых перанесіцца на 3-XII, у будынку інстытуту пэдагогікі і педалёгіі.

ЗАЎТРА:

— Кастрычн. РК КП(б)Б. У 18 гадз., у памяшк. РК КП(б)Б—нарада ўсіх загадчыкаў масавых сэктараў працы сярод жанчын, уключаючы пэхавых, заг. культмасавых сэктараў ЖАКТ'аў і кіраўнікоў дэлегацкіх сходаў, па пытаньнях: 1) Аб ходзе работы дэлегацкіх сходаў; 2) Аб месячніку «Беларуская Работніца і Сялянка». Яўка ўсіх жанарганізатараў абавязкова пад адказнасьць сакратароў ячэек.

— Дом Асьветы. Экскурсія тэхнікаўніку членаў саюзу працасьветы ў падпэфную вайсковую часьць. Збор у Доме Асьветы, у 5 гадз. вечара.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная кантора Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар . 10-74 | Начны рэдактар . 6-42
Сакратар . 6-19 | Галоўная кантора 7-31
Партсэктар . 13-80 | Аддзел падпіскі . 7-81
Сэктар інфармацыі . 13-80 | . абвестак . 7-81

Умовы падпіскі (з дарожным дадаткам „Прафрук")
На 1 мес. . . . — 90 к.
„ 3 мес. . . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . . 5 р. —
„ 12 мес. . . . 9 р. 75 к.

Плата за абвесткі:
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. падатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-31.

ЦКК-НК РСІ і ЦСПСБ склікаюць на 2 сьнежня у 7 гадз. вечара у памяшканьні ЦСПСБ (заля пасяджэньняў),

ШЫРОКУЮ НАРАДУ

членаў эканом. сэктараў савецкіх і гаспадарчых установаў, груп «ЛК» і рабочых прадпрыемстваў, якія шэфствуюць над установамі па пытаньні аб масавай праверцы фінансава-гаспадарчай дзейнасьці ўстаноў за 1929-30 г. (дакл. НК РСІ).

Лука абавязкова і без спазьненьня.

ЦСПСБ, рэдакцыі газэт «Зьвязда» і «Рабочий» склікаюць

агульна-гарадзкую нараду жонак рабочых „25-тысячнікаў".

Павінны зьявіцца ўсе старшыні ФЗМК, прадстаўнікі вытворчых саюзаў; персанальна выклікаюцца т. т.: Хаскін і Кумкес (Белкаапсаюз) і па 1 прадстаўніку ад ВСНГБ, Белкалгасцэнтру, НКПраны і ад МЦРК.

Запрашаюцца ўсе «25-тысячнікі», якія ў гэты дзень знаходзяцца ў Менску.

Нарада адбудзецца 1-га сьнежня ў 7 гадз. увечары у залі пасяджэньняў ЦСПСБ.

Усім ЦП саюзаў і ФЗМК прапануецца паведаміць жонак «25-тысячнікаў».

Крычаўскі РК КП(б)Б і рэдакцыя газ. «ЗЬВЯЗДА»

скліканць

На аўтораг, 9 сьнежня, а 12 г. дня ў памяшканьні крычаўскага Дому Культуры

РАЁННУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ

рабселькораў і членаў рэдкалегій насьц. нгазэт.

НА ПАРАДКУ ДНЯ:

Аб выданьні крычаўскай раённай газэты і задачах рабселькораў.

На канфэрэнцыю запрашаюцца ўсе члены насьценгазэт рэдкалегій і рабселькоры Крычаўскага раёну.

Крычаўскі РК КП(б)Б, рэдакцыя газ. «ЗЬВЯЗДА»

1-га сьнежня ў 6 гадзін вечара, у памяшканьні ЦК КП(б)Б

АРГАДДЗЕЛ ЦК КП(б)Б СКЛІКАЕ

НАРАДУ САКРАТАРОЎ ВЫТВОРЧЫХ ЯЧЭЕК гор. Менску

па пытаньні перабудовы парторгаў на прадпрыемствах.

Яўка сакратароў вытворчых ячэек і загадчыкаў арг. аддз. Фрунзаўскага Кастрычніцкага РК КП(б)Б абавязкова.

КЛЮБ імя КАРЛА МАРКСА
30 лістапада
2-гі вечар балету
прем'ерны вялікага дзяржаўнага тэатру Саюзу ССР
народны артыстка рэспублікі К. В. ГЭЛЬЦЭР
З удзелам: салістага вялікага тэатру Ул. Гельфгбэйн, вольнага мастака І. Шэльбэрг (скрыпка), З. Кітаеў (рояль).
Білеты прадаюцца штодзённа ў рабочай касе з 12 да 2 і з 4 да 6 г., у клюбе К. Маркса з 2 да 4 і з 6—8 г.
Пачатак роўна ў 8 з пал. гадз.

ЗОА-ВЫСТАУКА ЗЬВЯРЫНЕЦ
ДЗЯРЖЦЫРКУ Савецкая, 90, рог Ленінскай
адкрыта штодзённа з 8 г. ран. да 11 г. увеч.
ПРЫБЫЛІ НОВЫЯ ЗЬВЯРЫ:
леў, леапард, гіена палаватая, гіена плямістая, заўкі, мядзведзі, рысь, мураўсды, дзікабразы, барсукі, алень, сарбліод, арлы, кракадзіл, 20 малп і шмат іншае зьвярыны.
Школам і экскурсіям—льготная плата, скідка 40 проц.
Адміністрацыя.

Белдзяржвыдавецтва—сэктар кнігараспаўсюджваньня
ДА ПЕРАВЫБАРАЎ САВЕТАЎ
вышлі з друку
Я. РАКАЎ—Ліквідацыя акруг—узмацненьне нізавога савецкага апарату. Стар. 86. Цана 20 кап.
МІК. АРАБЕЙ—Роля сельскіх саветаў БССР у справе масавай калектывізацыі вёскі. Стар. 54. Цана 20 кап.
НА ДНЯХ ВЫЙДУЦЬ З ДРУКУ
МІЦЬКОЎ—Калгасы і перавыбары саветаў.
РЫЧКОЎ—Настаўніцтва і перавыбары саветаў.
ЛОДЫСЕЎ—Саветы і іх масавая работа.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА—
СЭКТАР КНІГАРАСПАЎСЮДЖВАНЬНЯ
ДА ВЕДАМА
партыйных школ і гурткоў!
ВЫШЛІ З ДРУКУ І ПРАДАЮЦЦА Ў КНІГАРНЯХ БДВ І Ў КРАМАХ СПАЖЫВЕЦКАЙ КАЛАПЭРАЦЫІ:
Праграма пачатковых партыйных школ на 1930-31 навуч. год. Цана 25 кап.
Праграма партыйных школ для кандыдатаў УсеКП(б). Цана 10 кап.

1-шае ў БССР Гукавое кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
2-я тыкавая праграма „Алімпіяда мастацтваў"
Гукавы кіно-агляд у 4 частках „ПОШТА" палітшарж у 2-х частках.
Каса—ад 4 гадз. увеч. Пачатак сэансаў—6, 7 з пал., 9, 10 з пал. гадз.

Кіно-тэатр „Культура"
Новы мастацкі фільм вытворчасьці БЕЛДЗЯРЖКІНО
НЯНАВІСЬЦЬ
Эпапэя ў 8-мі актах
Пачатак дзен. сэансаў у 1 гадз. і 2 г. 30 м., вечэрніх—у 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м.

КІНО „ЛІТЭРАТУРНЫЯНАЛ"
ВАЙСКОВЫ ГІСТАРЫЧНЫ ФІЛЬМ
1-ая КОННАЯ
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
кіно-хроніка Белдзяржкіно № 2
Пачатак 1 с. а 6 г.
Каса—ад 4 гадз. 30 м.

КІНО „Пралетары"
Мастацкі фільм
КАЛАМУТА
драма ў 7 частках.
Пачатак 1 сэансу ў 6 г., 2-га—7 г. 30 м., 3-га—9 г., 4-га—10 г. 30 м.
Каса—ад 4 з пал. гадз. веч.

Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР"
Мастацкі фільм
Нявольніки мора
ў 7 частках.
Пачатак 1-га сэансу ў 1 гадз., 2-га—2 г. 30 м.
— Каса—ад 12 гадз. дня —

КІНО „ПАРТАК"
2-я АПОШНЯЯ СЭРЫЯ
НІБЭЛУНГІ
(Помста Крымгільды).
Трагедыя ў 10 частках.
Пачатак сэансаў: 6 г. 30 м., 8 г. 30 м., 10 г. 30 м.
Каса адчыняецца з 12 г. дня.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр
НЯДЗЕЛЯ, 30 ЛІСТАПАДА.
Паказ для саюзаў транспартнікаў і нарэчаваньня.
У. КІРШОН „Горад вятроў"
п'еса ў 5 дзеях, 12 абразох.
Пастаноўка С. Разакова і М. Міцкевіча. Мастак Ю. Гольц. Музыка Старавадоскага. Дырыжэр І. Гітгарц. Хормэйстар М. Каўфман. Дырыжэр-лібрэтар Нунін.
— ПАЧАТАК у 8 гадз. веч. —

ЦП саюзу Саўгандальслужачых паведамляе, што сёньня, 30-га лістапада ў 7 гадз. вечару ў памяшканьні клюбу саюзу СГС
— АДБУДЗЕЦЦА —
пашыраны сход жанчын-актывістак, вылучэнак і ўдарніц саюзу СГС
з наступным парадкам дня: даклад НК РСІ аб ролі вылучэнкі і ўдарніцы ў савецка-гандлёвым апараце і судаклад ЦП саюзу аб удзеле жанчын-членаў саюзу СГС у работе прафарганізацый.
Яўка жанчын-актывістак, вылучэнак і ўдарніц абавязкова.
Запрашаюцца ўсе жанчыны—члены саюзу СГС.

ЦП саюзу саўгандальслужачых паведамляе, што 1-га сьнежня г. г. ў 7 гадз. вечару ў памяшканьні клюбу саюзу СГС адбудзецца
ПАШЫРАНЫ СХОД
менскага гарадзкога прафактыву саюзу саўгандальслужачых
з наступным парадкам дня: аб становішчы работы саюзу саўгандальслужачых і чарговыя задачы (дак. старшыні ЦП саюзу т. Плятнёва). На гэты сход у абавязковым парадку павінны зьявіцца ўсе старшыні і члены МК і ГК, грамадзкія інструктары сэктараў МК, ГК і ЦП саюзу, члены бюро ячэек грамадзкіх арганізацый.
Запрашаюцца ўсе члены саюзу.

З 1-га сьнежня г.-г. пачнецца
прыём заяў ад асоб, якія жадаюць паступіць на 1-шы курс Менскага Дзяннага Рабфаку Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту.
Да заявы павінны быць прыкладзены наступныя дакументы:
1. Аб узросьце (метрыка).
2. Аб стажы фізычнай працы.
3. Аб адносінах да вайсковай павіннасьці (для мужчын).
4. Аб асьвеце.
5. Аб стане здароўя паступаючага.
6. Аб сацыяльным і матар'яльным стане паступаючага і яго бацькоў пасьля рэвалюцыі.
7. Даведка аб выборчых правах.
8. Для сялян—акладны ліст або засьведчаная копія з яго па с.-г. падатку на 1929-30 г., а для санатужнікаў адпаведны дакумант аб падатку на 1929-30 г.
9. Анкета, заверэная прафесіянальнымі або савецкімі арганізацыямі і ўстановамі.
10. Камандыроўка ад НКА.
УВАГА: 1. Ніякія копіі дакумантаў ня прымаюцца (за выключэньнем дакумантаў аб адносінах да вайсковай павіннасьці).
У выпадку страты дакумантаў, павінен быць даны дубікат яго.
2. Да заявы трэба дадаць паштовыя маркі на 20 кап. для адказу падаўцу заявы.
Камандыроўкі Народным Камісарыятам Асьветы перадаюцца у ЦПСПБ і Цэнтркалгассаюзу, якія апошнімі пераслаць прадпрыемствам і райкалгассаюзам.
Заявы будуць прыймацца да 15 сьнежня; з 16 да 20 сьнежня будуць утвораны прыймовыя іспыты ў будынку Рабфаку (Менск, рог Чырвонаармейскай і Унівэрсытэцкай).
Прыймовая камісія будзе працаваць з 20 да 25 сьнежня.
Заняткі пачнуцца з 2-га студзеня 1931 г.

КУРСЫ АРУ па падрыхтоўцы бухгальтараў і рахуннаводаў для аўгусаў.
Слухачы забясьпечваюцца стыпэндыяй (для групы бухгальтараў—85 руб., для групы рахуннаводаў—95 р. у месяц).
У групу рахуннаводаў прымаюцца асобы, якія задавальняюць патрабаваньням рэгістрацыі іх на біржы працы, а таксама калгасьнікі, батракі, беднякі, сераднякі і іх угрыманцы.
У групы бухгальтараў прымаюцца бухгальтары, канбукі і рахуннаводы з 3-гадовым стажам.
Заявы прымаюцца ў канцылярыі АРУ (Савецкая, 55, пам. 6. Арбуду) ад 9 да 11 гадз. раніцы і ад 6 да 7 гадз. веч. Апошні тэрмін прыёму заяў—5 сьнежня.

ЖАКТ № 8 паведамляе пайначыкаў і жыхароў ЖАКТ'у, што 1-га сьнежня а 6 гадз. увечары у клюбе акрыканкому адбудзецца
агульны сход усіх жыхароў ЖАКТ'у № 8.
У парадку дня: 1) Справаздача праўленьня і рэвіз. камісіі. 2) Выбары праўленьня і рэвіз.